ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАЧЫ—XV
№ 114 (4018)
АЎТОРАК, 28 КРАСАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Янаўскі нацыянальны польскі сельсавет калектывізаваны на 44 проц.

СЬВІСЛАЧ.

Папулярызацыя пастаноў VI усесаюзнага зьезду саветаў аб калгасным будаўніцтве выклікала магутны калгасны прыліў у Янаўскім нацыянальным сельсавеце.

За апошнюю дэкаду красавіка АРГАНІЗАВАЛІСЯ З НОВЫЯ КАЛГАСЫ, куды ўвайшло 149 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Сельсавет калектывізаван на 44 проц.

Новаарганізаваныя калгасы па-ўдарнаму рыхтуюцца да другой бальшавіцкай вясны.

А. Б. НЯХАЕЎ.

34 новых калгасьнікаў у выніку пробных выездаў

КОПЫСЬ.

Калгасы Старасельскага сельсавету правялі пробныя выхады ў поле, якія паказалі, што яны па-ўдарнаму падрыхтаваліся да другой бальшавіцкай сяўбы.

У пробных выхадах прымала ўдзел шмат аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў.

За гэты дзень у калгасы ўступіла новых 34 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі.

У сельсавеце на сёньняшні дзень налічваецца 18 калгасаў, якія ядноюць 48,2 проц. усіх гаспадарак.

А. ГЕНІН.

27-ы ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

Шырокім паходам ЗА КОРМ З ГАЛЬЛЯ нанясем удар па бяскорміцы

РЭАЛІЗАВАЦЬ БАЯВУЮ ДЫРЭКТЫВУ ЦК КП(б)Б і СНК БССР: па-бальшавіцку разгортваючы сяўбу, яшчэ больш змагацца за ўздым калгаснага руху. Мабілізаваць увесь раённы і сельскі актыў на правядзеньне веснавой кампаніі

21 гадзіну ў суткі павінны працаваць трактары

Менск, 28 красавіка

Паводле апошніх даных другую бальшавіцкую вясну будуць праводзіць калі 190 тыс. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР, аб'яднаных у калгасы. Масавы рух сялянства ў калгасы павінен будзе яшчэ павялічыцца з разгарам палявых работ. Замацаваньне і пашырэньне гэтага руху шляхам ударнага правядзеньня сяўбы і бальшавіцкага нерамаганьня трудгасьцяй, што стаяць на шляху пасеўнай,—становіцца адказьнейшай задачай усіх партыйна-савецкіх і калгасна-земельных арганізацый.

Мы стаім на парозе разгортваньня масавай сяўбы на ўсёй БССР. Ня гледзячы на гэта перад намі рад ганебных прарываў у рабоце некаторых раённых арганізацый па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Недаацэнка і марудласьць ліквідацыі гэтых прарываў зьяўляюцца горшым відам апартунізму. Задачы веснавой кампаніі патрабуюць ліквідацыі ўсіх недахопаў, якія стаяць на шляху насьпяховага правядзеньня задач другой бальшавіцкай вясны.

Апартуністычная стаўка на завоз насеньня і бязьдзейнасьць загатоўчых арганізацый, і поўнае ігнараваньне засыпкі і абагуленьня насенных фондаў паставілі рад раёнаў перад пагрозай недахопу насеньня. Да 20 красавіка па БССР насенныя фонды ў калгасах створаны толькі на 57,7 проц., а па КСУ—на 50,3 проц. Перад радам раёнаў сёньня паўстала востра пытаньне: чым сеяць? Дзе атрымаць насеньне?

«Зьвязда» ў свой час пісала, што апартуністычная стаўка на завоз насеньня павінен быць дан адпор. Мясцовыя арганізацыі павінны былі прыняць усе захады да таго, каб мабілізаваць мясцовыя рэсурсы. Аднак, гэтыя паказаньні цэнтральнага друку на былі ўлічаны і аднаведных мер рад раёнаў ня прыняў. Мала таго, некаторыя вясковыя арганізацыі з-за недахопу кармоў пачалі скармліваць насенныя фонды. Замест яшчэ большага напружаньня сіл і мабілізацыі мясцовых рэсурсаў для стварэньня насенных і фуражных фондаў пачалі разбазарваць насеньне.

Як, калі ня правай практыкай і простай дапамогай кулаку трэба лічыць тое, што большасьць раёнаў абмяркоўвалі моўчкі і нічога не зрабілі па арганізацыі ўжываньня корму з гальля. Ніякіх абектыўных прычын, якія-б перашкаджалі гэтай рабоце, ня было і няма. Між тым, да гэтага часу мы сустракаем бюракратычнае супраціўленьне і коснасьць да гэтай справы, якое фактычна перарастае ў злачынства і льле ваду на млын кулака.

Зламаць коснасьць і апартуністычную недаацэнку значэньня корму з гальля—неадкладная задача ўсіх раённых арганізацый. Недапусьціць разбазарваньня ніводнага зерня і забясьпечыць засеў усяго яравога кліну. Пашырэньне пасеўнай плошчы і ўзьлым ураджайнасьці павінны быць выкананы поўнасьцю.

Сёньня мы друкуем пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб пасеўнай кампаніі. Паводле гэтай пастановы дазваляецца **ў крайнім выпадку**, пры недахопе насеньня **замяняць адны культуры другімі**, за выключэньнем ільну, канапель, бульбы і кораньплоду, але ні ў якім разе по зьмяншаць пасеўных плянаў.

Мы павінны даць сваячасовы і рашучы адпор усім тым, хто будзе імкнуцца нарушыць прынцыпы спецыялізацыі сельскай гаспадаркі, хто будзе спасылацца на недахоп насеньня, як на абектыўную прычыну і пад прыкрыцьцём яе імкнуцца скарачаць пасеўную плошчу.

Разгортваючы баявымі тэмпамі сяўбу, трэба адначасова ўзмацніць барацьбу за далейшы калгасны прыліў. У дні, што засталіся яшчэ да выхаду ў поле,—скончыць стварэньне насенных і фуражных фондаў, рамонт с.-г. інвэнтару, выканаць поўнасьцю пляны кантрактацыі, не пазьней як да 5 мая, пераўтварыць усе калгасы на зьдзельшчыну, ацененую ў працадзнёх і ліквідаваць «абязьлічку». Уся праца павінна ісьці баявымі тэмпамі, бо тэрміны сяўбы вельмі абмежаваны. Разам з тым трэба пакончыць з апартуністычнай недаацэнкай некаторых мясцовых арганізацый гаспадарчага замацаваньня калгасаў, асабліва новаарганізаваных. Абагуленьне коняй і кармоў для іх, ды асноўных сродкаў вытворчасьці павінна быць неадкладна скончана.

Шырока практыкаваць сумесныя выхады калгасаў і аднаасобнікаў у поле, дабіваючыся поўнага выкананьня аднаасобным сэктарам плянаў па засеве яравога кліну. Вось неадкладныя задачы сёньняшняга дня пастаўленыя ЦК КП(б)Б і СНК БССР. На выкананьне гэтых задач павінен быць мабілізаваны ўвесь раённы і вясковы актыў, калгасьнікі і бядняцка-серадняцкія масы.

Бальшавіцкая рэалізацыя дырэктывы вышэйшых органаў ад 27 красавіка па пасеўнай кампаніі зьявіцца лепшым адказам кулаку і яго агенту-апартуністу.

16,5 проц. росту калектывізацыі за час кампаніі па кантрактацыі

БЯГОМЛЬ.

МСЬЦІСКІ сельсавет — у першых радох барацьбы за кантрактацыю.

Мсьціскі сельсавет ПЕРШЫМ У РАЕНЕ СКОНЧЫЎ КАНТРАКТАЦЫЮ ЯРАВЫХ З ПЕРАВЫКАНАНЬНЕМ ПЛЯНУ ПА ТЭХНІЧНЫХ І КАРМОВЫХ КУЛЬТУРАХ.

Масавая работа па кантрактацыі выклікала ўзмацненьне калгаснага прыліву. ЗА ЧАС КАМПАНІІ ПА КАНТРАКТАЦЫІ СЕЛЬСАВЕТ ДАБІЎСЯ ЎЗРОСТУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ З 19 ДА 35,5 ПРОЦ.

Я.

БЮЛЕТЭНЬ № 24

На сёньняшні дзень на зьдзельную сыстэму работ пераведзена 2734 калгасы, альбо 49,9 проц. усіх калгасаў па 87 раёнах, ад якіх атрыманы весткі.

Дагэтуль упарта маўчаць аб тым, што робіцца ў іх раёнах па пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну—Чырвонапольскі, Чарэйскі, Чачэрскі, Уваравіцкі, Сураскі, Прапойскі, Коханаўскі, Касьцюковіцкі, Вульскі, Ветрынскі і Бешанковіцкі райкалгассаюзы.

Наперадзе па пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну ідуць Горацкі, Любаньскі, Вузьдзенскі, Смалявіцкі і Крычаўскі раёны (пераведзена на зьдзельшчыну ад 73 да 95-100 проц. усіх калгасаў гэтых раёнаў).

Плятуцца ў хвосьце Церахоўскі, (3,6 проц.), Парыцкі (5,9 проц.), Лагойскі (8,6 проц.), Гарадоцкі (13 проц.) і Юравіцкі (18,7 проц.).

Перашкаджае замацаваньню зьдзельшчыны ў калгасах, адсутнасьць стандартных форм уліку працы. Неабходныя формы ўліку працы, заказаныя Калгасцэнтрам Беларускаму Арбуду (600.000 экз. «табель», 300.000 экз. «штодзённых даносьняў брыгадзіра» і 500.000 экз. «працоўных кніжак» членаў калгасаў), затрымліваюцца друкаваньнем Гомельскім Палесдрукам. Мы патрабуем ад Палесдруку неадкладна, на ўдарным парадку выканаць заказ Калгасцэнтру. Партыйныя і грамадзкія арганізацыі друкарні Палесдруку мы заклікаем дапамагчы пераводу калгасаў на зьдзельшчыну.

Трэба прыняць рашучыя меры, каб у аспоўным скончыць перавод калгасаў БССР на зьдзельшчыну да 5-га мая г. г. Тым райкалгассаюзам, якія дагэтуль яшчэ раскачаліся, трэба напомніць наступную пастанову 3-га ўсебеларускага зьезду калгасаў: «Прызнаць нягодным, наскрозь апартуністычным, работу тых райкалгассаюзаў і калгасаў, якія недаацэньваюць і праятычна не праводзяць зьдзельнай сыстэмы работ, замест пачасовай і ўраўніцельнай».

Плянавае размеркаваньне рабочай сілы павінна зьявіцца абавязковым ярлікам у рабоце кожнага калгасу, асабліва ў час другой рашаючай бальшавіцкай веснавой пасеўнай кампаніі. Таму **на справу складаньня рабочых праграм** веснавой сяўбы у калгасах **неабходна зьвярнуць асабліва вялікую ўвагу**, арганізуючы шырокія масы калгасьнікаў на іх складаньне і кантроль за выкананьнем. Што-ж мы маем на справе? На сёньняшні дзень ёсьць пазведамленьні ад 26 райкалгассаюзаў, у якіх гаворыцца, што толькі па 953 калгасах складзены рабочыя праграмы веснавой сяўбы (па 50 проц. калгасаў, якія маюцца ў гэтых раёнах). І гэта ў той час, калі па наўдзіновых раёнах ужо пачынаецца масавая сяўба.

Неаходна прыняць самыя рашучыя меры да таго, каб рабочыя праграмы былі неадкладна складзены на ўсіх калгасах. Трэба мабілізаваць усе сілы, усю калгасную грамадзкасьць, каб выканаць гэтую важнейшую задачу. Не павінна быць ніводнага калгасу, які-б вёў веснавую сяўбу бяз пляну.

Асьвейская МТС да сяўбы не падрыхтавана

Сыгналы „Зьвязды" ня ўлічаны

Асьвейская МТС павінна сёлета апрацаваць 7.500 гэкт. яравога кліну. Дзя выкананьня пастаўленай перад ёю задачы МТС не гатова.

Ня гледзячы на тое, што «Зьвязда» ўжо сыгналізавала аб прарывах у Асьвейскай МТС, на зацяжку рамонту інвэнтару, на правал дагаворнай кампаніі, гэтыя недахопы і на сёньняшні дзень ня выпраўлены.

Асьвейская МТС за ўвесь час дагаворнай кампаніі ня мела ніякага прыліву ў калгасы. Ёсьць калгасы, не гаворачы аб аднаасобніках, якія на ведаюць пра МТС, пра яе існаваньне.

Да сяўбы засталіся лічаныя дні, а Асьвейская МТС на сёньняшні дзень ня мае ні аднаго плуга і іншага прычыннага інвэнтару да сваіх 25 трактараў.

Трактары, якія прыбываюць з Лёзна, патрабуюць капітальнага рамонту. Гэта ў той час, калі трэба выяжджаць у поле і калі гэтыя трактары ўсю зіму стаялі бяз руху. На сёньняшні дзень 15 трактараў ня маюць запасных частак. Прычэпны інвэнтар МТС і асабліва калгасны інвэнтар далёка яшчэ не адрамантаваны. З 168 калгасных плугоў адрамантавана ўсяго толькі 40

Дырэкцыя МТС вельмі пяўважліва адносілася да захаваньня інвэнтару і трактараў. Машынныя плугі іржаведі ў сьнезе. Па дарозе з калгасу «Шлях Леніна» ў МТС загруз трактар. У калгасе імя Варашылава пакінута ільнапеаробка.

Штаты МТС не ўкамплектаваны рахунковымі работнікамі і ніхто на гэта не зварачае ўвагі.

Такое становішча падрыхтоўкі МТС ставіць пад пагрозу зрыву правядзеньне веснавой кампаніі ў Асьвейскім раёне.

Трактарыст.

АДМІНІСТРАВАНЬНЕ ЗАМЕСТ МАСАВАЙ РАБОТЫ

ДРЫСА (ад наш спец. кар.).

У **Цястоўскім** сельсавеце па адным са сходаў, дзе прымаўся плян веснавой сяўбы, прадстаўніком Дрысенскага райкому КП(б)Б, інспэктарам райгандлю **Пятроўскай** былі дапушчаны «лявацкія» перагібы.

На сход вёскі Пятроўская запрасіла калгасьнікаў суседняга калгасу. Вельмі каштоўная рэч, калі калгасьнікі — апора савецкай улады на вёсцы — дапамагаюць у правядзеньні розных палітычных мерапрыемстваў.

У гэтай вёсцы раней старанна папрацаваў кулак. Пятроўская, як прадстаўнік райкому партыі, аднак, не арганізавала загадзя бедноты. Сход беднаты ня быў праведзен. У выніку кулацкай апрацоўкі па сходзе панавала «змова маўчаньня». Ніхто ня выказаўся, ніхто не галасаваў.

Што было патрэбна ў даным выпадку? Раней за ўсё арганізацыя беднаты, а потым ужо разам з беднатой і лепшымі сераднякамі пры дапамозе калгасьнікаў разьбіць кулацкую агітацыю. Гэтага ня было зроблена.

Пятроўская правяла прыём веснавога пляну так, што тыя, хто павінен быў прымаць плян, не галасавалі ні «за», ні «супроць». «За» галасагаці толькі калгасьнікі—суседзі.

Падобны факт не адзіны ў раёне.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па тых, хто масавую сыстэматычную работу імкнецца падмяніць грубым адміністраваньнем.

А. Л.

Масавы прыліў

Папулярызацыя пастаноў VI зьезду Саветаў у **ЖАРКАЎСКІМ** сельсавеце, Халопеніцкага раёну, дала новы масавы прыліў у калгасы. У вёсцы Люпец пасьля сходу 22 гаспадаркі з 27 аб'ядналіся ў калгас. Вёска Каршавіцы ўся ўступіла ў калектыў.

За апошні час процант калектывізацыі сельсавету павысіўся з 15 да 40.

УСІМ ГАРКОМАМ, РК КП(б)Б і РВК

ЦК і СНКБ канстатуюць, што пастанова красавіцкага пленуму ЦК не праведзена яшчэ ў жыцьцё і агульная падрыхтаванасьць да пасеву па БССР застаецца ўсё яшчэ недастатковай. У гэтым годзе сяўба праходзіць за ўмовах спозьненай вясны і значных разбурэньняў у асобных раёнах у сувязі з паводкай. Ноў одна зараз-жа пераключыць усю работу на алярацыйнае кіраўніцтва скончэньнем падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы.

ЦК і СНКБ чакае ад усіх партыйных і савецкіх арганізацый максымальнага напружаньня работы па ліквідацыі выпікаў паводкі і адначасова разгортваньні работы па правядзеньні сяўбы. Абавязваем вас максымальна скарыстаць дні, што засталіся, для ноўнай мабілізацыі існуючых рэсурсаў насеньня, фуражных фондаў, скончэньня рамонту ўсіх трактараў, сельска-гаспадарчых машын, інвэнтару і скончэньня кантрактацыі.

Неадкладна арганізуйце выхад на поле саўгасаў, калгасаў і аднаасобных гаспадарак, дабіваючыся арганізацыі сумесных выхадаў калгасьнікаў і аднаасобнікаў у поле з тым, каб араць і сяўбу правесьці ў максымальна ранні і кароткі тэрмін.

Забясьпечце перавод на зьдзельшчыну ўсіх калгасаў да 5 мая.

ЦК і СНКБ прапануе вам і абавязвае ўпаўнаважаных Трактарацэнтру, дырэктароў МТС і саўгасаў зараз-жа забясьпечыць скарыстаньне ўсяго трактарнага парку і цягавае сілы на ворыва ў тых мясцох раёну, дзе гэтае ворыва ўжо магчыма. Устанавіць работу трактара—21 гадзіну ў суткі. Увесь сельскі, раённы, партыйны і беспартыйны актыў павінен быць мабілізаваны для работы па правядзеньні сяўбы і бязмоўнага выкананьня і скончэньня ўсіх падрыхтоўчых прарыемстваў. Цэнтральных працаўнікоў, якія знаходзяцца ў раёне, пакінуць на месцы да асобнага распараджэньня ЦК.

У 3-хзьменны тэрмін павінны быць адноўлены пераправы праз рэкі ў тых мясцох, дзе былі зруйнаваны і зьнесены масты ў мэтах забясьпячэньня перакідкі трактараў і іншых сродкаў вытворчасьці, зьвязаных з пасеўнай кампаніяй. ЦК і СНК абавязвае вас выканаць заданьні па стварэньні насенных фондаў.

У выпадку невыстарчальнай колькасьці насеньня асобных культур, дапусьціць, як выключэньне, замену іх іншымі культурамі, за выключэньнем ільну, канапель, бульбы і кораньплоду, плошча якіх паводле пляну павінна быць засеяна поўнасьцю.

ЦК і СНК катэгарычна і рашуча асуджаюць настроі аб немагчымасьці арганізацыі прыліву ў калгасы ў часе правядзеньня веснавой сяўбы, якія назіраюцца ў радзе месц. ЦК і СНК разглядаюць такія настроі, як дэмабілізацыйныя, праваапартуністычныя, і патрабуюць ад Калгасцэнтру, усёй калгаснай сыстэмы і ўсіх раённых партыйных і савецкіх арганізацый пэ толькі не дапускаць аслабленьня тэмпаў калектывізацыі, а рашуча ўзмацніць, праводзячы веснавую сяўбу, падрыхтоўку і ўборку ўраджаю пад лозунгам арганізацыі прыліву ў калгасы.

Асабліва непапушчальнае адставаньне па калектывізацыі мае месца па Рэчыцкім, Жлобінскім, Парыцкім, Бабруйскім, Чачэрскім, Быхаўскім, Чавускім, Барысаўскім, Капаткевіцкім, Сроцінскім і Гарадоцкім раёнах. ЦК і СНК разглядаюць адставаньне тэмпаў калектывізацыі ў гэтых раёнах, як няўменьне і нездольнасьць раённых арганізацый арганізаваць практычнае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Сакратар ЦК **ГЕЙ.**

Старшыня СНК **ГАЛАДЗЕД.**

27 красавіка 1931 г.

Апартуністы адкладваюць

абагуленьне рабочай жывёлы, перавод калгасаў на зьдзельшыру

ВУШАЧЫ. У КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫХ ГАСПАДАРКАХ ПА РАЕНЕ ЁСЬЦЬ 1.046 ШТУК РАБОЧАЙ ЖЫВЁЛЫ, З ЯКІХ АБАГУЛЕНА ТОЛЬКІ 634. ПРАЎЛІНЬНЕ КАЛГАСАЎ НЕ ВЯДЗЕ НІЯКАЙ РАБОТЫ ДЛЯ ХУТЧЭЙШАГА АБАГУЛЕНЬНЯ ЎСЁЙ РАБОЧАЙ ЖЫВЁЛЫ.

НАСЕННЫХ ФОНДАЎ ПА РАЕНЕ САБРАНА 52 ПРОЦ., СТРАХАВЫХ — 17 ПРОЦ. АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ ВЫКАНАНА НА 91 ПРОЦ.

ВЕЛЬМІ ДРЭННА ПРАХОДЗІЦЬ РАМОНТ ІНВЭНТАРУ. ТАК ПЛУГОЎ АДРАМАНТАВАНА 83,1 ПРОЦ., ВОРАН — 46,1 ПРОЦ., КАЛЕС—63 ПРОЦ. І Г. Д.

ЯШЧЭ ГОРШ СТАЦЬ СПРАВА З РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕМ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ МАШЫН ПА КАЛГАСАХ. НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ НА СКЛАДАХ РАЙКААПСАЮЗУ ЛЯЖЫЦЬ ШМАТ МАШЫН, У ЯКІХ КАЛГАСЫ АДЧУВАЮЦЬ ВЯЛІКУЮ ПАТРЭБУ, АЛЕ ЧАМУСЬЦІ ЯНЫ НЕ РАЗЬМЯРКОЎВАЮЦЦА. ТАКОЕ-Ж АМАЛЬ СТАНОВІШЧА З МІНЭРАЛЬНЫМІ ЎГНАЕНЬНЯМІ.

РАЕННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ АДДАЮЦЬ НАЛЕЖНАЙ ЎВАГІ ПЫТАНЬНЮ АРГАНІЗАЦЫІ КАРМАВЫХ ФОНДАЎ. У ВЫНІКУ НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ПЛЯН АРГАНІЗАЦЫІ КАРМАВЫХ ФОНДАЎ ВЫКАНАН НА 35 ПРОЦ.

З 64 КАЛГАСАЎ РАЕНУ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ ПЕРАЙШЛО ТОЛЬКІ 20 КАЛГАСАЎ.

Норма работы—выпрацоўка лепшага калгасьніка

ПІКЛОЎ. КАМУНА «ІСКРА» АРГАНІЗАВАЛАСЯ Ў 1927 ГОДЗЕ З 4 СЕМ'ЯЎ. НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ СКЛАД КАМУНЫ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ ДА 33 СЕМ'ЯЎ.

КАМУНАРЫ ПРЫСТУПІЛІ ДА ПЕРАХОДУ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ. ПЫТАНЬНЕ АБ ПЕРАВОДЗЕ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ БЫЛО ПРАПРАЦАВАНА НА ПРАЎЛЕНЬНІ КАМУНЫ З АКТЫВАМ, А ЛЮТЫМ НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ КАМУНЫ. КАМУНАРЫ ПРЫНЯЛІ САМЫ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У ВЫПРАЦОЎЦЫ НОРМ.

У АСНОВУ НОРМ ВЫПРАЦОЎКІ ЎЗЯТА ПРАКТЫКА ЛЕТАШНЯЙ РАБОТЫ ЛЕПШЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДПАВЕДНЫЯ НОРМЫ, ДАСЛАНЫЯ БЕЛКАЛГАСЦЭНТРАМ.

НА ДОГЛЯДЗЕ РАБОЧАЙ ЖЫВЁЛЫ ВЫПРАЦАВАНЫ НАСТУПНЫЯ НОРМЫ. АДЗІН КОНЮХ ДАГЛЯДАЕ 15 КОНЯЙ, ПРЫЧЫМ ЁН АДКАЗВАЕ ЗА ДОБРЫ І СВАЯЧАСОВЫ ДАГЛЯД, ЗА ДАЧУ КАРМОЎ. ЎСЁ ГЭТА ЗАЛІЧВАЕЦЦА Ў АДЗІН ПРАЦАДЗЕНЬ. ДОГЛЯД РАБОЧАЙ ЖЫВЁЛЫ Ў АДЗІН ПРАЦАДЗЕНЬ ВЫЛІЧВАЕЦЦА ЎЗІМКУ ПРЫ ДОГЛЯДЗЕ 25-30 ШТУК, УЛЕТКУ — 50 ШТУК.

АДНА ДАЯРКА ПАВІННА ЗА АДЗІН ПРАЦАДЗЕНЬ ПАДАЦЬ 10 КАРОЎ ТРЫ РАЗЫ Ў ДЗЕНЬ.

УСЯ ЖЫВЁЛА ПРЫМАЦАВАНА ДА ПААСОБНЫХ КАМУНАРАЎ, ЯКІЯ АДКАЗВАЮЦЬ ЗА ЦЭЛАСЬЦЬ, ЗАХАВАНЬНЕ Ў ЧЫСТАЦЕ ЖЫВЁЛЫ І СВАЯЧАСОВАЕ КАРМЛЕНЬНЕ.

УСЯ РАБОЧАЯ СІЛА Ў КАМУНЕ РАЗЬМЕРКАВАНА ПА АСНОЎНЫХ ГАЛІНАХ РАБОТ І РАЗЬБІТА НА БРЫГАДЫ. ДА БРЫГАД ПРЫМАЦАВАНА ЦЯГАВАЯ СІЛА І СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ ІНВЭНТАР. АБЯЗЬЛІЧКА Ў КАМУНЕ ЛІКВІДАВАНА. БРЫГАДЫ І ПААСОБНЫЯ КАМУНАРЫ ЗАКЛЮЧЫЛІ ПАМІЖ САБОЙ ДАГАВАРЫ НА ЛЕПШУЮ РАБОТУ Ў ЧАСЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

ЯН.

Насеньне траў—адсталы вучастак

ДРЫБІН.

60 проц. калгасаў раёну (41 калгас) пераведзены на зьдзельшчыну.

Для ўзмацненьня работы ў гэтай галіне створаны спецыяльныя брыгады з раённых і сельсавецкіх работнікаў.

Адным з слабых месц падрыхтоўкі да сяўбы — забясьпечанасьць калгасаў насеньнем траў. Так, насеньнем канюшыны калгасы забясьпечаны толькі на 32 проц., вікай — на 31 проц., сіласнымі культурамі — на 42 проц.

Пашкевіч.

З пасеўнага фронту

МАЗЫР, 27. (Па тэлеграфу). Першыя дні палявых работ у калгасах «ПРАВДА», «НОВЫЯ ХАЛАДНІКІ», «БЕЛАРУСКАЯ ВЕСКА» і «КАЛЕКТЫВІСТ» НА ПРАКТЫЦЫ ПАКАЗАЛІ ЭФЭКТЫЎНАСЬЦЬ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ. Прадукцыйнасьць працы калгасьнікаў значна павялічылася ў параўнаньні з леташнім годам.

Устаноўленая ў гэтых калгасах, выходзячы з выпрацоўкі лепшых калгасьнікаў, НОРМА ВОРЫВА адналямешным плугам у 0,5 гэкт. ВЫКОНВАЕЦЦА і нават ПЕРАВЫКОНВАЕЦЦА.

Калгасьнікі вітаюць укараненьне зьдзельшчыны, ацененай ў працаднёх.

Учора ў калгасах ПАЧАЛАСЯ МАСАВАЯ СЯЎБА.

У сувязі з выхадам у поле ўзмацніўся прыліў у калгасы. КАЛГАС БОБРАНЕЦКАГА сельсавету за некалькі дзён сяўбы ВЫРАС больш чым У ДВА РАЗЫ.

ГАЛАЎНЕЎ.

* * *

ЮРАВІЧЫ, 27. (Па тэлеграфу). Калгас «РУХАВІК РЭВАЛЮЦЫІ» вышаў у поле, падрыхтаваны да сяўбы. КАЛГАСЬНІКІ АББЯСЬЦІЛІ СЯБЕ УДАРНІКАМІ другой бальшавіцкай вясны.

* * *

ЮРАВІЧЫ, 27. (Па тэлеграфу). Калгас «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» пачаў веснавую сяўбу. Ужо засеяна 913 кгр. пубіну. Перад выхадам у поле была УВЕДЗЕНА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА, ацененая ў працаднёх. Калгасьнікі разгортваюць паміж сабою сацыялістычнае спаборніцтва.

* * *

БУДА-КАШАЛЕВА, 27. (Па тэлеграфу). Новаарганізаваны калгас імя Сталіна, які аб'яднаў 304 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, распачаў сяўбу. Узарана 4 гэкт. Засеяна паўтара гэктара пшаніцы.

* * *

СМАЛЯВІЧЫ, 27. (Па тэлефону). Калгасы «КОЛАС», «БАЛЬШАВІК», «ГУДОК», «КУЛЬТУРА» і імя КАЛІНІНА пачалі палявыя работы, ідзе ворыва на высокіх мясцох.

ЧЫКУН.

* * *

СЛУЦАК, 27. (Па тэлеграфу). КАЛГАС ІМЯ 1-га МАЯ першым у Случчыне пачаў сяўбу. За дзень засеяна 11 гэкт. аўса. Запэўняем ЦК КП(б)Б і Калгасцэнтр, што СКОНЧЫМ СЯЎБУ ДА 20 МАЯ.

Старшыня калгасу БЛАШТЭЙН.
Сакратар парт'ячэйкі ЛІЎШЫЦ.

* * *

БАРЫСАЎ, 27. (Па тэлефону). Калгас «ДОМБАЛЬ» і саўгас «ПАЛЕЛЮМ» пачалі сяўбу. Калгасам «Домбаль» за ўчарайшы дзень заараны 4 гэктары, саўгасам «Палелюм» — 20 гэктараў.

РАКІТА.

Корм з гальля

замест нехапаючых сена і саломы

Існуючы зараз крызіс з трубымі кармамі ня можа быць ліквідаваны па працягу бліжэйшых месяцаў, а тым больш у надышоўшую веснавую пасеўную кампанію. Ня трэба ўскладаць асаблівых надзей і на сьвежы падножны корм. Веснавыя траы, бязмоўна, аслабяць крызіс, але пасеўнай кампаніі мала дапамогуць, у асаблівасьці не дапамогуць у бяскормніцы галоўнай цягавай сіле—коням.

Беларусь мае патрэбу ў завозе з іншых абласьцей некалькіх тысяч тон сена і саломы, для чаго патрабавалася-б такая колькасьць вагонаў, якая ніяк ня можа быць зараз прадастаўлена транспартам.

Застаецца адзіны для нас выхад—адшукаць у межах Беларусі ўласныя кармавыя рэсурсы.

Што-ж мы можем зрабіць у гэтых адносінах? Ці можам мы правесьці з сталоўчымі вынікамі мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў.

У сучасных умовах шпаркага развіцьця ўсяе савецкае гаспадаркі, і у прыватнасьці жывёлагадоўлі, можна было-б адшукаць значную частку кармоў праз рацыянальнае выкарыстаньне рознастайных адкідаў харчовай прамысловасьці, праз устанаўленьне эканамнога і рацыянальнага выкарыстаньня наўдных кармоў.

Але зараз, у даную пасеўную кампанію гэта ня выхад са створанага становішча, бо гэтымі пытаньнямі толькі зараз займецца арганізаванае ўсесаюзнае аб'яднаньне кармовай прамысловасьці—«Союзпрамкорм».

Пры такім становішчы прыходзіцца падумаць аб зусім новых крыніцах кармоў.

Таксама новым для нас відам корму, бязмоўна, зьяўляецца корм з гальля (драўнянае сена), аб якім мы ўжо ня раз чыталі на старонках усіх газэт.

Нам ужо вядома, што корм з гальля даволі шырока і пастаянна ўжываецца за граніцай, асабліва ў Нямеччыне, Францыі, а таксама Фінляндыі, дзе адна трэцяя частка кармоў для жывёлы—гэта корм з гальля.

Корм з гальля прыгатаваны з тонкіх (да 1 сантыметру) галінак лісьцёвых парод, роўны на спажыўнасьці сярэдняй якасьці лугавога сена, а некаторыя пароды дрэваў, як напрыклад, акацыя, альха, ліпа маюць у сябе спажыўных матэрый (бялкоў і крухмалу) больш чым звычайнае сена.

Каровы, коні, авечкі і козы вельмі добра перапрацоўваюць корм з гальля. Ён ня выклікае пры ўмелым ужываньні захворваньняў (паступовае ўжываньне для жывёлы гэтага корму, зьмешванае яго са звычайнымі моцнымі кармамі і інш.). І больш таго, мы гэтымі днямі чыталі ў нашым друку адозву калгасьнікаў калектыву «Чырвоная зара», дзе жадаюцца корм з гальля ўжываўся ў шырокім разьмеры з леташняй восені і ў выніку—удой кароў павялічыўся на 23 проц., малако атрымлівалася тлусьцей і гусьцей.

Але, ня гледзячы на ўсе гэтыя становучыя даныя, корм з гальля, з вялікімі трудасьцямі ўкараняецца ў нашых саўгасах і калгасах. Нашы гаспадарнікі ніяк ня могуць забыць аб «Саюзхлебе», які іх раней забясьпечваў сенам, яны ніяк ня могуць згадзіцца з тым, што ні сена, ні саломы нельга больш атрымаць і ўпарта ня гледзячы на цыркуляры і інструкцыі з цэнтру (Наркамзему, Калгасцэнтру, Саюзхлеба, Саюзлеспрому і інш.) не выкарыстоўваюць невычарпальных крыніц кормў, г. зн. лясоў і хмызьнякоў, акружаючых іх з усіх бакоў.

Прайшло ўжо тры месяцы, як нашым гаспадарнікам і грамадзкім арганізацыям стала вядомым, што замест нехапаючых сена і саломы можа быць з посьпехам выкарыстан корм з гальля, і мы пакуль на ведаем у Беларусі ні аднаго саўгасу і калгасу, які-б шырока ўжываў у сябе гэты корм, ня гледзячы на надзвычайную патрэбу ў кармох, дзе-дзеньню у некаторых з іх да падзяжу жывёлы або да заўчаснага забою яе.

Неабходна ўжываць бальшавіцкія тэмпы і сьмеласьць і ў справе ўжываньня ў нас корму з гальля. Неабходна напаў грамадзкасьці і ў першую чаргу камсамолу і мясцовамуладу разгарнуць шырокую растлумачальную кампанію аб неабходнасьці загатовак корму з гальля і разьбіць кансэрватызм гаспадарнікаў, аднаасобна дапамагчы ім у выраўнаньні ўскладзеных на іх задач у частцы разьвіцьця жывёлагадоўлі і правядзеньня пасеўнай кампаніі.

Кармы ў нас ёсьць, але трэба менш жаданьне і ўменьне іх выкарыстаць. Наступіўшае разводзьдзе і цёплае надворʼе некалькі ўскладняюць загатоўку кормў з гальля, а іменна: патрэбна больш намаганьняў і затрат на збор галінак і падвозу іх да месца пераапрацоўкі ў корм на сілаасарэны або сячкарні. Патрэбна асцярожнасьць пры захаваньні пераезнага корму з гальля, бо ў цёплае надворʼе ён можа гарэць і псавацца (як і ўсякі корм, які мае у сябе вялікі процант вільгаці), высушыць-жа яго зараз няма магчымасьці.

Але гэтыя невялікія перашкоды ні ў якім выпадку не павінны нас сьпыніць. **Корм з гальля зьяўляецца зараз адзіным сродкам, якім мы можам перамагчы бяскормніцу, адзіным сродкам, які дае магчымасьць з посьпехам закончыць пасеўную кампанію.**

Н. Сямёнаў.

Новыя калгасы ствараюць кармовыя фонды

КАСЬЦЮКОВІЧЫ.

Распрацоўка пастаноў VI-га зьезду саветаў па Сімчаўскім сельсавеце выклікала нарастальнае прыліву ў калгасы. За апошнюю дэкаду ў існуючыя калгасы ўлілося 98 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. На 16-га красавіка сельсавет калектывізаван на 48 проц.

Новыя калгасьнікі абагульваюць цягавую сілу і інвэнтар. Ствараюць кармовыя фонды.

Рыжын.

Чырвоныя абозы з сенам і саломай

НАРОЎЛЯ. (Наш кар.). Да апошняга часу загатоў

ЛЮТУЕ ФАШЫСЦКІ ТЭРОР

на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне

КАТАВАНЬНІ Ў ЛУЦКУ, ЛІДЗЕ, КОБРЫНЕ—ШТОДЗЕННАЕ ЗЬЯВІШЧА

Польскі фашызм імкнецца ператварыць Зах. Беларусь—пляцдарм будучай вайны—у могільнік „супакою і парадку"

Аб падрыхтоўцы польскага фашызму да вайны супроць СССР

З прамовы тав. БОГЕНА (КПЗБ) на XI пленуме ВККІ па дакладу тав. Кашэна

Таварышы, я хачу закрануць пытанне аб падрыхтоўцы польскага фашызму ў Заходняй Беларусі да вайны. Польскі фашызм рыхтуецца і палітычна і эканамічна вельмі ўзмоцнена да гэтай вайны. У апошні год асабліва моцна назіраецца шалёнае цкаванне супроць Савецкага Саюзу і асабліва вострыя нападкі па БССР. Штодзённа польская проса напоўнена рознымі байкамі. Асабліва шалёнае цкаванне і атакі вядуцца па нацыянальную палітыку КП большэвіцкоў Савецкай Беларусі. Арышт групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў у Менску і іх уласныя прызнаньні асабліва выразна паказалі сувязь беларускай контр-рэвалюцыі з польскім фашызмам, размеркаваньне паміж імі работы, упягненьне ў «работу» выдатнейшага атамана Булак-Балаховіча і інш. Пасьля гэтых зломаскаваньняў ролі польскага імпэрыялізму, асабліва вострыя зрабіліся нападкі ў апошні час супроць БССР.

У той-жа час польскі фашызм імкнецца вядучы сваю аграрную палітыку, узмацніць беларускага кулака, прыцягнуць на свой бок частку беларускай інтэлігенцыі і пры дапамозе шалёнага тэрору ўзмацніць беларускі нацыянал-фашызм. Дагэтуль рабіліся розныя спробы. Ня гледзячы на ўсе нядбаньні фашызму ў гэтай справе, у апошні час зазначаецца ўзмацненьне гэтых спроб у розных формах і ў форме гвалтоўнага насаджэньня нацыянал-фашыстаў у розных культурных установах, у форме розных субсыдый, нацыянал-фашыстам, што мае на мэце ўзмацненьне ваеннай базы польскага фашызму ў Заходняй Беларусі. Ведаючы, што большасьць насельніцтва супроць акупантаў, польскі фашызм стараецца знайсьці сваю базу сярод кулакоў. Тэрор, які бушаваў за ўвесь час польскай акупацыі, асабліва ўзмацніўся ў апошні час на Заходняй Беларусі. У апошні час, як і на Заходняй Украіне, ён ператварыўся ў нясупынную жудасьць, у вялізныя карныя экспэдыцыі. Тое, што было ў Луцку, паўтараецца ўсюды, у Лідзе і іншых мясцох. Мы бачым тут імкненьне да фізычнага знішчэньня рэвалюцыйнага авангарду працоўных мас — кампартыі ЗБ. Асабліва моцны ўдар накіраваны цяпер супроць нацыянальна-вызваленчага руху.

Бандыцкі салёт на тав. Тарашкевіча і арышт яго, калі ён прытрымліваў праз Дзяцінскі калідор, гаворыць аб тым, што польскі фашызм імкнецца што-б там ни стала «нацыфізаваць» Заходнюю Беларусь, ператварыць пляцдарм блізкай вайны ў могільнік «супакою і парадку».

Мы мелі ў Заходняй Беларусі некалькі розных пэрыядаў у разьвіцьці і росьце рэвалюцыйнага руху. Пасьля магутнага росту рэвалюцыйнага руху ў 1924-25 гадох, які знайшоў свой выраз у партызанскім руху, пачынае, у зьвязку з працэсам распластаваньня вёскі, выкрышталізоўвацца рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух. Вырастае магутная арганізацыя пад назвай Грамада, якая аб'ядная вакол сябе больш 100.000 членаў. Пад якімі лёзунгамі яна выступала? Яна выступала пад лёзунгамі барацьбы супроць польскай акупацыі і адзінага фронту з пралетарыятам і працоўным сялянствам усёй Польшчы. Але гэта магутная арганізацыя была разьбіта польскім фашызмам пры дапамозе тэрору. Пасьля гэтага было разгромлена «Таварыства Беларускай Школы»,—дванаццацігадовая культурная беларуская арганізацыя. У апошні час штодзённа праводзяцца масавыя арышты, прычым арыштоўваюць ня толькі камуністаў, ня толькі тых, каго падазраюць у сымпатыях камунізму, але кожнага, хто мае хоць якую-небудзь сувязь з нацыянальна-вызваленчым рухам.

У адносінах тэрору, напрыклад, характэрны апошнія выбары, калі былі скасаваны ўсе сьпісы рабоча-сялянскага бляку, калі гвалтоўным шляхам пры дапамозе пячуванага жорстакага тэрору і фальсыфікацыі, усе мандаты былі ўзятыя пілсудчыкамі. Характэрна выступленьне бывшага кіраўніка Усходняга Аддзелу Міністэрства Замежных Спраў фашысцкага ураду, Галуэкі (цяпер — кіраўнік фашысцкага клюбу ў сойме) з адкрытай пагрозай па адрасе Заходняй Беларусі. Ён заявіў, што калі выбары на ЗБ пойдуць на лініі 1928 г. (калі рабоча-сялянскі блёк атрымаў прыблізна каля 300.000 галасоў), дык на Заходняй Беларусі паўтарыцца тое, што было на Заходняй Украіне, г. б. карныя экспэдыцыі ва ўзмоцненай форме. Але фашызм, баючыся атрымаць такі вынік, як у 1928 годзе, проста ефальсыфікаваў вынікі выбараў.

Затым ідзе такое мерапрыемства, як насаджэньне асаднікаў, так званых, ваенных калёністаў, лік якіх раўняецца 9.000. Гэтыя асаднікі, ваенныя калёністы, насаджаны стратэгічна ў тых пунктах, якія павінны адыграць у будучай вайне важнейшую ролю. Яны, безумоўна, узброены, іх асады зьяўляюцца ваеннымі апорнымі пунктамі. Маршалак Пілсудскі зьяўляецца начальнікам. Яны павінны адыграць сваю ролю ня толькі ў будучых ваенных дзеяньнях, але ўжо і цяпер. Калі паліцыя ня можа справіцца з сялянамі, дык туды заўсёды накіроўваюцца гэтыя атрады. Апроч таго, апошні час узмацнецца дзейнасьць фашыцкай ваеннай арганізацыі «Стрэлец», якая стараецца розныя спосабамі завербаваць у свае рады беларускіх рабочых і беларускіх сялян. Школы мілітарызуюцца. Асабліва ўвага зьвяртаецца на чыгуначнікаў. У апошні час прыцягваюць чыгуначнікаў у Заходняй Беларусі падпісваць такі дагавор, што яны ў часе вайны ня толькі ня будуць заставаць, а выдадуць польскай аховы кожнага чыгуначніка, які будзе за гэта агітаваць.

Цяпер будуюцца новыя ваенныя дарогі. У апошні час на ЗБ пабудавана адна ваенная дарога і праектуецца правесьці другую ваенную чыгунку, якая павінна зьвязаць Беларускую Пушчу з граніцай. У гэтых падрыхтоўках да вайны ў саюзе з беларускімі нацыянал-фашыстамі прымае ўдзел, асабліва ў апошні час, яўрэйская буржуазія у Польшчы. Між іншым, характэрны такі факт, калі ўкраінская буржуазія ў Польшчы падала заяву ў Лігу Нацый, «абвінавачваючы» Польшчу ў арганізацыі карных экспэдыцый і г. д., польскі фашысцкі ўрад зьвярнуўся да яўрэйскай буржуазіі і яўрэйская буржуазія выступала за мяжой і ў Польшчы ў абарону польскага фашызму, падтрымліваючы ўсякі спосабамі фашысцкі рэжым. Яўрэйская буржуазія і клер выступаюць усюды, як застрэльчыкі вайны супроць СССР. Яўрэйская буржуазія падтрымлівала разгром беларускіх працоўных мас. Мы бачым у апошні час размеркаваньне ролі паміж польскім фашызмом і яўрэйскай буржуазіяй як у Заходняй Беларусі, так і на Заходняй Украіне. Яўрэйская буржуазія адыгрывае ролю фарпоста польскага імпэрыялізму, ролю калёнізатара, там дзе польскае насельніцтва слабае, у мястэчках і гарадох на Валыні і Заходняй Беларусі і іншых мясцох.

Тав. Браткоўскі ўжо многа гаварыў аб ролі сацыял-фашызму. Я не хачу паўтарацца. Роля ППС і ў Варшаве, Вільні і ў Львове аднолькавая. Але некалькі слоў я хочу сказаць аб Бундзе, аб яўрэйскім сацыял-фашызме. Тут трэба сказаць, што асабліва ў апошні час, у зьвязку з вялікім ростам радыкалізацыі мас, узмацнілася шалёнае цкаваньне з боку Бунду супроць СССР. Калі ў першыя гады Бунд, маючы яшчэ ў сябе многа яўрэйскіх рабочых, якія адыйшлі цяпер ад яго, стараўся быць больш асьцярожным і выступаючы адкрыта супроць кампартыі, ставіць граніцы:—«вось кампартыя, а вось Савецкі Саюз»,—дык у апошні час, асабліва ў часе працэсу меншавікоў, дзе былі закрануты яго кроўныя браты Рубіны, Абрамовічы і г. д., тут ён паказаў свой твар. Ва ўсім гэтым шакальні і вымушаны Бунд ідзе рука аб руку з ППС. Калі ў апошнія гады зазначаецца асабліва моцнае зьбліжэньне Бунду з ППС, дык яно адбылося па гэтай асноўнай лініі барацьбы супроць кампартыі і барацьбы супроць Савецкага Саюзу...

Арганізацыяй ударных брыгад імя „518" і „1040" адкажам на тэрор фашысцкіх апрычнікаў

Канфэрэнцыя ўдарнікаў Барысаўшчыны выносіць свой рашучы пратэст супроць нячуваных катаваньняў і забойстваў лепшых прадстаўнікоў рабочае класы і працоўнага сялянства і заталеньня ў крыві нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

У адказ на тэрор азьвярэлых фашысцкіх катаў мы, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі, з яшчэ большай настойлівасьцю і упартасьцю будзем змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, шляхам перагляду норм выпрацоўкі ў бок іх павялічэньня, зьніжэньня расцэнак і гэтым самым больш забясьпечым выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Рэвалюцыйная барацьба рабочае клясы і працоўных мас Польшчы супроць фашыцкай дыктатуры дадасьць нам яшчэ больш энтузіязму, які мы пакіруем на разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на арганізацыю ўдарных брыгад імя «518» і «1.040», на бальшавіцкае правядзеньне веснавой сяўбы, уздым калгаснага руху, на ліквідацыю кулацтва як лясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

На катаваньні палітзьняволеных турэмнымі катамі мы адкажам яшчэ большым узмацненьнем пралетарскай і інтэрнацыянальнай салідарнасьці з замежнымі братамі па клясе, якія вядуць упартую гэраічную барацьбу з фашысцкай дыктатурай за рабоча-сялянскую ўладу, за сусьветны Кастрычнік.

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне працоўных мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Крывавым тэрорам не зламаць рэвалюцыйнай барацьбы працоўных Зах. Украіны і Зах. Беларусі

Заслухаўшы інфармацыю аб страшэннай хвалі белага тэрору ў фашысцкай Польшчы, **рабочыя заводу «Домбаль»** канстатуюць: Буржуазная фашысцкая Польшча, гэты авангард сусьветнага імпэрыялізму шалёнымі тэмпамі рыхтуецца да ўзброенага нападу на бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту — СССР

Адным з важнейшых момантаў гэтай падрыхтоўкі **зьяўляецца разгул белага тэрору і зьверскае задушэньне нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне.** Дзікія катаваньні ў катажных турмах і засьценках фашысцкіх ахранак лепшых барацьбітоў за пралетарскую рэвалюцыю, разгром культурна-асьветных арганізацый як ТБШ, беларускага каапэрацыйнага банку і арышты пяцідомных правадыроў і барацьбітоў нацыянальна - вызваленчага руху тав. Тарашкевіча і іншых, — вось **крывавы шлях польскіх акупантаў і беларускіх нац.-фашыстаў Астроўскага, Луцкевіча і К°, якім яны імкнуцца падрыхтаваць узброеную інтэрвэнцыю супроць СССР.**

Агульны сход заклікае ўсе працоўныя масы Польшчы згуртавацца вакол камуністычнай партыі на барацьбу з дыктатурай фашызму, за Савецкую Польшчу.

Рабочыя пастанаўляюць аддаць усе сілы на выкананьне і перавыкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на ўзмацненьне абароназдольнасьці савецкай краіны, шляхам масавай арганізацыі ўдарніцтва і сацспаборніцтва. У адказ на шалёны тэрор польскага фашызму агульны сход абяцае разгарнуць энэргічную работу па дапамозе палітзьняволеным і іх сем'ям.

Няхай жыве УсеКП(б) — арганізатар і кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР

Шчыльней рады вакол камуністычнай партыі

Разгул крывавага тэрору польскага фашызму на акупаванай Зах. Беларусі і Зах. Украіне, а таксама ў карэннай Польшчы, зьяўляецца адным з галоўных этапаў падрыхтоўкі узброенай інтэрвэнцыі супроць першай пралетарскай даяржавы — СССР.

Вядучы ліхаманкавую падрыхтоўку да нападу на Савецкі Саюз, польскі фашызм шляхам шалёнага тэрору імкнецца задушыць нацыянальна вызваленчы рух беларускіх і украінскіх мас, якія перашкаджаюць яго імпэрыялістычным плянам.

Разгром беларускага рабоча-сялянскага клюбу «Змаганьне» і шматгадовыя катаржныя прысуды над яго кіраўнікамі, разгром беларускага каапэрацыйнага банку, культасьветных установаў, як Тав. Бел. Школы, арышт правадыра Беларускай Грамады—Тарашкевіча, арышт усяго зьезду ППС-Лявіцы і цэлы рад іншых праяў тэрору, аб чым кожны дзень паведамляюць з павстаў, вёсак і гарадоў Зах. Беларусі і Зах. Украіны — вось шлях польскага фашызму і беларускіх нацыянал-фашыстаў — Луцкевічаў, Астроўскіх і К°, якія, бароначы інтарэсы беларускай буржуазіі і кулацтва, прадаліся фашысцкай ахранцы.

Мопраўскі актыў і працоўныя г. Пятрыкова рашуча пратэстуюць супроць крывавага пагрому ў Зах Беларусі і Зах. Украіне і ў адказ на тэрор і падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР,—заклікаюць ўсіх працоўных шчыльней згуртаванага вакол КП(б)Б для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, для ўзмацненьня нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны — СССР і ўзмацненьня баездольнасьці Чырвонай армії. Сход пастанаўляе правесьці энэргічную мопраўскую работу на дапамозе барацьбітом рэвалюцыі, якія пакутуюць у турмах фашысцкай Польшчы.

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

Прэч крывавы фашысцкі тэрор!

Прэч падпальшчыкаў вайны!

Ня гледзячы на паліцэйскія рэпрэсіі—

шырока разгортваецца падрыхтоўка да 1 мая

Кампартыя Нямеччыны заклікае працоўных пад сьцягі рэвалюцыйнага пралетарыяту

БЭРЛІН, 26. Цэнтральны першамайскі камітэт Бэрліна, акруговы камітэт Бэрлін-Брандэнбургскай арганізацыі кампартыі зьвярнуліся з адозвай да працоўнага насельніцтва Бэрліна, у якой заклікаюць да першамайскай дэманстрацыі, пад сьцягам рэвалюцыйнага пралетарыяту.

«Галоўным лёзунгам чырвонага Бэрліна ў дзень 1-га мая,—заканчвае адозва,—зьяўляецца масавая палітычная забастоўка і арганізаваньне здраджаных сваімі лідэрамі сацыял-дэмакратычных і нацыянал-сацыялістычных рабочых пад сьцягам рэвалюцыйнага пралетарыяту і кампартыі». (ТАСС).

„Ня гледзячы на забарону, мы едзем у СССР"

РЫГА, 26. Як ужо паведамлялася, 11 сацыял-дэмакратычных рабочых, выбраных у склад аўстрыйскай першамайскай делегацыі ў СССР, ня гледзячы на забарону ЦК аўстрыйскай сацыял-дэмакратычнай партыі, сёньня выязджаюць у Савецкі Саюз. Сёньняшняя «Ротэ Фане» апублікуе наступную заяву гэтых делегатаў:

— Ня гледзячы на забарону, мы едзем у Савецкі Саюз для таго, каб, выконваючы даручэньне аўстрыйскага пралетарыяту, азнаёміцца з сацыялістычным будаўніцтвам у СССР і ўзмацніць саюз між рабочай клясай Аўстрыі і СССР.

Мы разглядаем нашу паездку не як простае наведваньне, а **як дэманстрацыю міжнароднай салідарнасьці.** У процівагу гэтаму, паездкі ў Італію і іншыя фашысцкія краіны, якія наладжваюцца культурным сэктарам ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі, мы разглядаем як спробы зрыву міжнароднай пралетарскай салідарнасьці. (ТАСС).

Ваенныя караблі супроць першамайскіх дэманстрацый

БЭРЛІН, 26. Паводле вестак камуністычнай **«Гамбургер Фольксэйтунг»** у Гамбурге адпраўляецца некалькі мінаносцаў, якія будуць у баявой гатоўнасьці дзяжурыць у гавані. Спэцыяльная пасылка ваенных караблёў у Гамбургскую гавань прадпрынята ў сувязі з **першамайскімі дэманстрацыямі** і зьяўляецца нячуванай правакацыяй, накіраванай супроць рэвалюцыйных рабочых. (ТАСС).

„Мы хочам уласнымі вачыма бачыць гіганцкі размах сацыялістычнага будаўніцтва краіны Саветаў"

БЭРЛІН, 26. Амэрыканская рабочая делегацыя, якая едзе на першамайскае сьвята ў СССР, складаецца з 28 прадстаўнікоў амэрыканскіх рабочых галоўнымі чынам, прадстаўнікоў транспартных і сельска-гаспадарчых рабочых і 5 жанчын, з іх дзьве жонкі фэрмэраў, адна прадстаўніца швейных рабочых і тры хатнія работніцы.

Делегацыя выкарыстала свае кароткае знаходжаньне ў Нямеччыне, каб перадаць нямецкім рабочым брацкія прывітаньні амэрыканскага пралетарыяту. Делегацыя зьвярнулася да нямецкіх працоўных з адозвай, у якой паказвае, што 10 млн. беспрацоўных і галадаючых рабочых, работніц і рабочай моладзі запаўняюць вуліцы гарадоў Злучаных Штатаў. Мільёны амэрыканскіх фэрмэраў ня маюць магчымасьці прадаць свае прадукты. У выніку гаспадарчага крызісу Амэрыка перажывае хвалю масавых звальненьняў рабочых, скарачэньні зарплаты і нагоршаньне ўмоў працы. У той час, як амэрыканскі ўрад **траціць мільярды долараў на вайсковыя мэты, ён не расходуе ні аднаго гроша на страхаваньне ад беспрацоўя.** За апошнія 8 год, **4 млн. фэрмэраў павінны былі кінуць сваю гаспадарку і** паехаць з гораду з прычыны падзраджаньня сродкаў вытворчасьці і цэнтралізацыі ў руках капіталістаў рынку збыту. У той час, як **2 млн. тон сельска-гаспадарчых прадуктаў сьвяло падвергаюцца пасаванню для таго, каб штучна павысіць цэны,** фэрмэры і амэрыканскім дітаце на мяцо мясцы аддаюць нават самыя неабходныя прадукты. Хваляваньне выклікае ўжо шырокія масы на топкі фасолі і жэрэбу, якія аддаюць фантастычна нізкія цэны.

«У часе нашага кароткага знаходжаньня ў Нямеччыне,—заканчвае делегацыя,—мы бачылі **нячуванае абдзеўшае медкай рабочай клясы.** На фоне сусьветнага ікаманамічнага крызісу вынікаюць толькі адна краіна, якая выкліканае жавасьць ня толькі з боку рабочых, але і капіталістаў. Гэта краіна—Савецкі Саюз. Мы хочам выкарыстаць нашу кароткую магчымасьць для таго, каб уласнымі вачыма бачыць тое, што ажыцьцяўляецца з такім размахам напружаньнем рабочых і сялянамі Савецкага Саюзу—будаўніцтва сацыялізму, індустрыялізацыя, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, паляпшэньне сацыяльнага становішча і ўмоваў працы, уваядзеньне 7-гадзіннага рабочага дня, пяцідзёнку і г. д.

Мы запрошаны Савецкімі прафсаюзамі, каб дапамагчы ім вывучыць і нашым вопытам работы і развіцьця амэрыканскай прамысловасьці. Мы ня чым іншым задачу вешаем, вядзем толькі для нас самых і для амэрыканскіх рабочых, але і для тысячаў рабочых і сялян Савецкага Саюзу. Мы прыехалі ў Савецкі Саюз, не як турысты, а як **сур'ёзнага вывучэньня сацыялістычнага будаўніцтва.** Адозва падпісана 7 удзельнікамі амэрыканскай делегацыі. (ТАСС).

„Мы гатовы грудзьмі стаць на абарону бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту"

КІЕЎ, 26. Прыехала група нямецкіх чыгуначнікаў для ўдзелу ў першамайскіх сьвятах. Нямецкія чыгуначнікі зьвярнуліся да ўсіх рабочых СССР з прывітаньнем, у якім гаворыцца:

«Мы горача вітаем вас з чырвоным сьвятам сусьветнага пралетарыяту. Нашае асабліва гарача прывітаньне рабочым Масквы, Ленінграду, Баку, Кіева і гарнякам капалень «Наклонай» і гэроям рэвалюцыі, гэраічнай калёне пераможнікаў, якія выканалі пяцігодку за два з паловай гады. Гэта перамога сьведчыць аб тым, што сацыялістычная індустрыя СССР, за першыя два гады пяцігодкі гіганцкімі крокамі пасунулася наперад. Ваша непахісная воля, шчырая адданасьць пралетарскай рэвалюцыі—зьяляецца прыкладам для рабочых Нямеччыны. Мы вучымся ў вас, як трэба змагацца, каб перамагчы капіталістаў, і ў недалёкай будучыні пад сьцягам Леніна пайдзі на апошні штурм капіталізму. **Мы гатовы ў любую мінуту грудзьмі стаць на абарону вялікага сацыялістычнага будаўніцтва. Мы гатовы** бязьлітасных баёў з тымі, хто пасмеліцца ўзьняць руку на бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту».

Партыйнае будаўніцтва

Палітасьветныя ўстановы

ператворым у сапраўдныя дамы культуры

Узмацніць партыйнае кіраўніцтва палітасьветнай і культурна-масавай работай цалкам падпарадкаваўшы яе задачам рэканструкцыйнага пэрыяду

Палітасьветную работу— на вышыню задач рэканструкцыйнага пэрыяду

Палітыка-асьветная і культурна-масавая работа — магутны сродак у змаганьні вясковых партарганізацый за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі. Між тым, рад мясцовых партарганізацый і органаў нарасьветы яўна недаацэньваюць таго вялізнага значэньня, якое мае палітыка-асьветная і культурна-масавая работа ў справе прапаганды генэральнай лініі партыі, у справе мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў, батрацтва, беднаты і серадняку вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы. Іменна ў рэзультаце гэтай недаацэнкі мы маем такое становішча, што палітыка-масавая работа на вёсны пастаўлена яўна нездавальняюча, яна адстае ад задач рэканструкцыйнага пэрыяду.

«Хата-чытальня павінна быць культурным цэнтрам па сацыялістычнай перабудове вёскі, па ўздыме яе культурнага ўзроўню» (Кагановіч). Ці зьяўляюцца нашы хаты-чытальні гэтымі культурнымі цэнтрамі? У значнай сваёй частцы хаты-чытальні, шардамы і іншыя культурна-асьветныя ўстановы на вёсцы сапраўднымі культурнымі цэнтрамі на сацыялістычнай перабудове вёскі не зьяўляюцца. Не зьяўляюцца па тэй простай прычыне, што ня здолелі сваю работу падначаліць задачам рэканструкцыйнага пэрыяду, ня здолелі сваёй практычнай дзейнасьці ўвязаць з тымі палітычнымі і гаспадарчымі кампаніямі, якія партыяй праводзяцца на вёсцы. У радзе раёнаў хаты-чытальні ня толькі не разгарнулі работы па-баявому, а нават зусім не адчуваюцца як палітычныя і культурныя асяродкі на вёсцы. У Буда-Кашалёўскім, напрыклад, раёне ні ў адным калгасе не пастаўлена як сьлед палітыка-масавая і культурна-асьветная работа. У Вышацкім раёне з сямі хат-чытальнь, якія ёсьць у раёне, працуюць толькі чатыры. І то гэтая работа далёка не адпавядае тым гіганцкім палітычным задачам, якія пастаўлены партыяй па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ня лепшае становішча мы маем у Капыльскім і радзе іншых раёнаў

Усе гэтыя факты выразна гавораць аб тым, што раённыя партарганізацыі і парт'ячэйкі недапушчальна дрэнна кіравалі работай паліт-асьветных установаў, а часамі проста забываліся на іх, не скарыстоўвалі як магутнага сродку ў змаганьні за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. У рэзультаце гэтага мы апынуліся перад фактам зусім слаба разгорнутай сеткі паліт-асьветных устаноў, перад фактам іх дрэннага матар'яльнага забесьпячэньня, перад фактам незабясьпечанасьці адпаведна падрыхтаванымі кадрамі.

Сёньня мы зьмяшчаем пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб становішчы работы палітасьветустаноў на вёсцы. Гэта пастанова вызначае рад мерапрыемстваў, накіраваных на забесьпячэньне перабудовы ўсёй палітыка-асьветнай работы на вёсцы. Таму на яе рэалізацыі павінны быць ужыты самыя неадкладныя і рашучыя меры. Партыйныя арганізацыі, мабілізуючы масы на выкананьне пастановы ЦК, павінны дабіцца таго, каб палітасьветная работа была пастаўлена на тую палітычную выцыню, на якую не ставіць партыя. Пастанова ЦК вызначае пашырэньне палітасьветных устаноў з такім разьлікам, каб да канца пяцігодкі было ня менш адной хаты-чытальні ў кожным сельсавеце. Пры гэтым прапанавана рэарганізаваць народныя дамы і хаты-чытальні ў дамы культуры, а чырвоныя куткі калгасаў — у калгасныя клюбы. Уся гэта работа павінна быць праведзена ў самы карацейшы тэрмін.

У адносінах кадраў палітасьветработнікаў ужыта рад мер як па іх падрыхтоўцы, так і па скарыстаньні тых таварышоў, якія скончылі палітасьветныя ўстановы.

Пастанова ЦК — зьяўляецца важнейшым палітычным дакумантам. Вакол яго трэба неадкладна мабілізаваць самыя шырокія партыйныя масы і ўсю савецкую грамадзкасьць вёскі, з тым, каб уся палітасьветработа і па сваёй форме, і зьместам была пастаўлена на службу ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва. У час правядзеньня асноўных гаспадарча-палітычных кампаній мы мелі такія факты, калі палітасьветустановы некаторых раёнаў стаялі ў баку ад гэтай важнейшай работы. У сувязі з гэтым кампаніі ў гэтых раёнах праходзілі марудна. Зараз, калі партыйныя арганізацыі, разам з масамі калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў прыступілі да практычнай рэалізацыі праграмы другой бальшавіцкай вясны, палітыка-асьветная работа павінна быць падначалена задачы поўнага выкананьня і перавыкананьня гэтай праграмы. Палітыка-масавая работа павінна быць прыстасавана так, каб на палявых работах у часе перапынку калгасьнік мог чытаць газэту, каб у гэты час праводзіліся гутаркі на палітычныя і агравытворчыя тэмы. У вогуле палітасьветную работу ў летні пэрыяд трэба праводзіць такімі мэтадамі, праз такія формы, якія дадуць як мага лепш эфэкт.

Задача партыйных арганізацый і органаў Наркамасьветы, а таксама ўсёй пралетарскай грамадзкасьці — як мага ў кароткі тэрмін і як мага лепш рэалізаваць пастанову Цэнтральнага Камітэту. Толькі пры гэтай умове мы культурнаасьветную работу паставім на службу задачам сацыялістычнага будаўніцтва, яшчэ больш узьнімем актыўнасьць мас і пакіруем яе на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Аб рабоце палітасьветных установаў на вёсцы

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Сучаснае становішча палітыка - асьветнай і культурна - масавай работы на вёсцы, асабліва ў сацыялістычным сэктары, зьяўляецца яўна нездавальняючым. Гэта работа значна адстае ад задач рэканструкцыйнага пэрыяду і ад узросшых запатрабаваньняў працоўных мас (зусім слаба разгорнута сетка і дрэннае матар'яльнае забесьпячэньне палітасьветных установаў, незабясьпечанасьць кадрамі і мерапрыемствамі па іх падрыхтоўцы, непрыстасаванасьць работы палітасьветных установаў да выкананьня асноўных задач партыі і ўраду).

Усё гэта зьяўляецца вынікам палітычнай недаацэнкі ,зусім слабага кіраўніцтва гэтай адказьнейшай галіной культурнага будаўніцтва як з боку органаў народнай асьветы, так і з боку мясцовых партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і іншых арганізацый.

Адзначаючы вялікую ролю і значэньне палітасьветнай работы, асабліва ва ўмовах шпаркіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і абвостранай клясавай барацьбы, Сакратарыят ЦК КП(б)Б, ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць Наркамасьветы, гаркомам і райкомам КП(б)Б, Белкалгасцэнтру, Белкаапсаюзу і ЦСПСБ узьняць палітасьветную работу на належную палітычную вышыню, рашуча забясьпечыўшы штодзённае кіраўніцтва ёю ў напрамку мабілізацыі актыўнасьці рабочых, батрацтва, калгасных, бядняцка - серадняцкіх мас на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і выкананьні чарговых палітычна-гаспадарчых задач і кампаній.

2. Даручыць Наркамасьветы і Дзяржпляну распрацаваць плян разгортваньня сеткі масавых палітасьветных устаноў з такім разьлікам, каб да канца пяцігодкі было ня менш адной хаты-чытальні на кожны сельсавет. Прадугледзець значнае пашырэньне будаўніцтва новых памяшканьняў для палітасьветных устаноў, а таксама забесьпячэньне апошніх адпаведным абсталяваньнем, прыцягнуўшы для гэтага падставе адзінага пляну культур будаўніцтва сродкі прафсаюзных, пэрацыйных, калгасных і іншых арганізацый і ініцыятыву самога працоўнага насельніцтва.

3. Даручыць Наркамасьветы і Дзяржпляну ў месячны тэрмін рэарганізаваць сучасныя кардамы, якія ёсьць у іх, у раённыя дамы культуры, павінны стаць арганізуючым і мэтавым цэнтрам усёй палітыка - асьветнай і масавай работы ў раёне; хаты-чытальні—у сельскія дамы культуры, чыя куткі ў калгасах—у калгасныя клюбы. Адначасова арганізаваць у вялікім населеным пукце культпункты, рабудаваўшы формы і мэтады работы палітасьветных установ у адпаведнасьці з запатрабаваньнямі рэканструкцыйнага пэрыяду.

4. Прапанаваць Наркамасьветы, гаркомам і райкомам КП(б)Б зарэгістраваць і прыступіць да масавай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі палітасьветных работнікаў праз арганізацыю кароткатэрміновых курсаў. Гаркомам і райкомам КП(б)Б спыніць частыя перакідкі і зьмены палітасьветных работнікаў, ліквідаваць загадчыкаў хат-чытальнь і кладна ўкамплектаваць культасьветустановы там, дзе яны не ўкамплектаваны. Лічыць неабходным вярнуць работу ў палітасьветных установах таварышоў, якія скончылі палітычныя тэхнікумы і спэцыяльныя курсы ў пэрыяд 1930 г., якія працуюць у іншых установах, за выключэньнем браных на адказныя пасады, ва СНК выдаць адпаведную пастанову Наркамасьветы і Дзяржпляну з мэтаю пачыць адкрыцьцё з будучага бюджэту новых навучальных устаноў для падрыхтоўкі кадраў сярэдняй вышэйшай кваліфікацыі для работы палітасьветных установах.

5. У мэтах пашырэньня кінафікацыі і радыёфікацыі на вёсцы, даручыць СНК удасканаліць справу фондаваньня, павінны быць скарыстаны для гэтага ненужныя кінафікацыі і радыёфікацыі першую чаргу сацыялістычнага сэктару вёскі.

6. Наркамасьветы разам з адпаведнымі арганізацыямі ўпарадкаваць і ўдасканаліць тэхнічную справу, зачысьціць бібліятэкі ідэалёгічна - варожай і ўстарэлай літаратуры, стварыўшы рэспубліканскі, гарадзкія і раённыя фонды для ўзмацненьня бібліятэк новай літаратуры і арганізацыі бібліятэк-перасовак.

7. Заслухаць даклад Наркамасьветы аб культурным абслугоўваньні працоўных мас нацменшасьцяй.

8. ЦСПСБ разам з Наркамасьветы распрацаваць рад мерапрыемстваў, паляпшэньні работы клюбаў і чытальнь і куткоў па абслугоўваньні прафсаюзных мас на вёсцы, асабліва сельскагаспадарчых рабочых і батрацтва.

9. Прымаючы пад увагу, што да часу ва многіх раёнах адсутнічае палітасьветная інспэктура, прапанаваць Наркамасьветы, гаркомам і райкомам КП(б)Б неадкладна ўкамплектаваць штаты апошніх. Гаркомам і райкомам у далейшым не дапушчаць зьмяшчэньня работнікаў, прапанаваць Наркамасьветы, гаркомам і райкомам і ЦСПСБ, Белкалгасцэнтру і Белкаапсаюзу зараз-жа разгаркуць падрыхтоўку зьезду.

10. Прызнаць неабходным правесьці не ўсебеларускага зьезду палітасьветработнікаў, прапанаваць Наркамасьветы, гаркомам і райкомам і ЦСПСБ, Белкалгасцэнтру і Белкаапсаюзу зараз-жа разгаркуць падрыхтоўку зьезду.

11. Гэту пастанову апублікаваць у друку.

Няма настойлівасьці ў разгортваньні палітасьветнай работы

З 7 хат-чытальнь, якія існуюць на тэрыторыі Вушацкага раёну, на сёньняшні дзень фактычна працуюць толькі 4.

Між тым, становішча культпалітасьветнай работы ў раёне паогул і па несаўгаспах, сельсаветах і прыватнаўласьніках знаходзіцца не на патрэбнай вышыні. Весьніцкая хата-чытальня, якая знаходзіцца пры мяжы, здавалася-б, павінна была разгарнуць сапраўды шырокую работу, асабліва ў сувязі з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы. Гэта тым больш неабходна, калі мець на ўвазе становішча з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы на сельсавеце.

Весьніцкі сельсавет — самы адсталы ў справе разгортваньня калектывізацыі. У вёсках гэтага савету кулакі і заможнікі ў сваёй клясавай - варожай дзейнасьці часамі не атрымліваюць патрэбнага адпору. У гэты самы час хата-чытальня знаходзіцца без кіраўніцтва ўжо на працягу двух месяцаў.

Такое становішча характэрна ня толькі для адной хаты-чытальні. Факты з Весьніцкага сельсавету кідаюць крамень на ўсяльнае становішча культпалітасьветнай работы ў раёне. У гэтай галіне ёсьць проста абуральныя факты.

На пошце цэлы месяц ляжыць літаратура для хат-чытальнь з адзнакай «пасеўная». Райінспэктар палітасьветы ніякіх мер ня прымае для таго, каб літаратуру разаслаць па сельсаветах і хатах-чытальнях. У Коблічкай хаце-чытальні загадчыкам зьяўляецца чалавек, які ня так даўно растраціў паўтары тысячы рублёў і асуджан нарэшце.

Гэтыя два факты даюць права зрабіць вывад наконт адносін райінспэктарыяту парасьветы да выкананьня дырэктыў партыі аб разгортваньні культпалітасьветнай работы на вёсцы.

Зільбэрт выключан з партыі

Бюро парт'ячэйкі і прафкамітэту бляшанага цэху распушчаны

УДАРНІК ГОЛЬДФАРБ АДНОУЛЕН У БРЫГАДЗЕ

(Пастанова бюро парткалектыву заводу „Камунар")

Заслухаўшы інфармацыю тав. БЕЛЬСКАГА аб пастанове бюро парт'ячэйкі бляшанага цэху разам з актывам, і агульнага сходу рабочых бляшанага цэху, бюро парткалектыву канстатуе:

Ня гледзячы на папярэджаньні бюро парткалектыву ад 4-га красавіка аб тым, што ў бляшаным цэху былі праяўленьні рвацкія тэндэнцыі пры ўстанаўленьні норм і расцэнак у сувязі з атрыманьнем новага заказу на выраб варонак, бюро цэх'ячэйкі ня стала на чапе рабочых цэху для найлепшага правядзеньня гэтага важнага мерапрыемства, а, наадварот, дапусьціла грубую папітычную памылку, пацягнуўшыся ў хвасьце адсталых рвацкіх элемэнтаў у цэху, якія паказалі няправільныя нормы выпрацоўкі і пачалі цкаваньне прыкладнага ўдарніка тав. ГОЛЬДФАРБА, які паказаў правільную норму.

Члены партыі, якія працуюць у гэтай брыгадзе, старшыня цэхкамітэту і член бюро цэх'ячэйкі тав. КРАВЕЦ і брыгадзір тав. ЗІЛЬБЭРТ займаліся цкаваньнем і абвясьцілі ГОЛЬДФАРБУ байкот аж да няпрыйму яго на работу ў брыгаду. Такія паводзіны бюро цэх'ячэйкі і членаў партыі зьяўляюцца горшым відам праяўленьня правага апартунізму — практыцы.

Брыгада Зільбэрта, падаўшы заяву аб зьніжэньні расцэнак на 8 проц., ня гледзячы на прыработак у 250 проц., займалася «очковтирательством» і гэтым самым яна ўвяла ў зман заводзкую грамадзкасьць.

Выходзячы з гэтага бюро калектыву ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1) За тое, што бюро цэх'ячэйкі пляпося ў хвасьце адсталых рвацкіх элемэнтаў цэху па пытаньні аб перагляндзе норм і расцэнак, не рэагавала на цкаваньне лепшага ўдарніка тав. Гольдфарба і не давяло да ведама бюро парткалектыву аб ўсёй гэтай справе, што зьяўляецца правым апартунізмам на практыцы, БЮРО ЦЭХ'ЯЧЭЙКІ РАСПУСЬЦІЦЬ.

2) Старшыня цэхкамітэту тав. КРАВЕЦ, знаходзячыся ў гэтай брыгадзе, ня прыняў адпаведных захадаў да зьніжэньня расцэнак і невыстарчальнае асьвятленьне ўсяго гэтага пытаньня, Бюро парткалектыву даручае рэдкалегіі ВЫПРАВІЦЬ ГЭТУ ПАМЫЛКУ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ.

3) Бюро парткалектыву адзначае, што заўком ДА СЁНЕШНЯГА ДНЯ НЯ ПРЫНЯЎ НІЯКІХ МЕР СУПРОЦЬ ГЭТАГА ЗЬЯВІШЧА, што зьяўляецца сьгнапам слабай работы заўкому ў кампаніі перагляду норм і расцэнак. Заводзкаму камітэту — неадкладна мабілізаваць усю заводзкую грамадзкасьць вакол гэтай ганебнай справы, УВЯЗАЎШЫ З КАМПАНІЯЙ ПЕРАГЛЯДУ НОРМ І РАСЦЭНАК.

4) За праяўленьне рвацтва, за ўдзел у цкаваньні ўдарніка тав. Гольдфарба, невыяўленьне правільнай нормы выпрацоўкі, за падачу заявы аб зьніжэньні расцэнак на 8 проц., маючы прыработак у 250 проц., што зьяўляецца адным з відаў праяўленьня правага апартунізму на практыцы, СТАРШЫНІ ЦЭХКОМУ ТАВ. КРАВЕЦУ АБВЯСЬЦІЦЬ СУРОВУЮ ВЫМОВУ З ПАПЯРЭДЖАНЬНЕМ, а брыгадзіра ЗІЛЬБЭРТА, як кіраўніка гэтай ганебнай справы, ВЫКЛЮЧЫЦЬ З ПАРТЫІ. Зільбэрта замяніць іншым брыгадзірам, аднавіўшы тав. Гольдфарба ў брыгадзе.

5) Лічыць памылковым зьмяшчэньне ў шматтыражцы заявы брыгады Зільбэрта аб зьніжэньні расцэнак і невыстарчальнае асьвятленьне ўсяго гэтага пытаньня, Бюро парткалектыву даручае рэдкалегіі ВЫПРАВІЦЬ ГЭТУ ПАМЫЛКУ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ.

6) Для растлумачэньня гэтай пастановы ў бляшаным цэху і падрыхтоўкі да правядзеньня перавыбараў да 1-га мая, вылучыць тав. ГУРЭВІЧА.

7) Мабілізаваць усю заводзкую грамадзкасьць шляхам абмеркаваньня па цэхах гэтага пытаньня—для яшчэ большага творчага ўздыму і актыўнасьці вакол задач выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

8) Пастанову бюро асьвятліць у друку.

9) На наступным бюро заслухаць вынікі ажыцьцяўленьня гэтай пастановы.

Ударнікі „Камунара" даказваюць рвачам

25-га красавіка ў бляшаным цэху заводу «Камунар» адбыўся сход камуністаў і камсамольцаў цэху. Заслухаўшы пастанову бюро парткалектыву, сход парашыў змыць ганебную пляму шляхам арганізацыі ўдарнай брыгады імя «518» і пры атрыманьні новай работы (заказ на варонкі выканан) выступіць сустрэчным павялічаньня нормы.

26-га красавіка адбыліся агульныя сходы рабочых ткарнага і слясарнага цэхаў. Рабочыя ўхвалілі пастанову бюро парткалектыву і патрабавалі паказальнага суда над рвачамі.

У адказ на выязку рвачоў брыгада Караваева зьнізіла расцэнкі на выпрацоўку валаў з ды́скамі на 17 проц. (з 6 р. да 5 р.). Брыгада Шлегеля Бацько зьнізіла расцэнкі на выпрацоўку шківаў таксама на 17 проц. (з 1 р. 15 кап. да 1 р.). Брыгада Фэйгіна зьнізіла расцэнкі на часткі да сьвідравальных варыятатаў на 7 проц. (з 75 кап. да 70 к.).

У слясарным цэху пасьля сходу, прысьвечанага справе Зільбэрта, створаны тры вытворчыя камуны: імя «518», «1040», і «Трэцяга рашаючага году пяцігодкі». Брыгада Лютарэвіча добраахвотна зьнізіла расцэнкі на 1.000-кілёграмныя адкідныя кувыркі—на 29 проц. (з 31 р. да 22 р.), на 500-кілёграмныя—на 38 проц. (з 29 р. да 18 р.), на 250-кілёграмныя—таксама на 38 проц. (з 24 р. да 15 р.).

У іншых цэхах ідзе абмеркаваньне гэтага пытаньня. Заводзкія арганізацыі мабілізуюць рабочых і ўдарнікаў на больш актыўны ўдзел у перагляндзе норм і расцэнак. Гэта будзе лепшым адказам рвачам і адсталым элемэнтам, якія робяць спробы сарваць выкананьне прамфінпляну.

„Змыйце ганебную пляму"—

ПАТРАБУЮЦЬ РАБОЧЫЯ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ АД КАМУНАРЦАЎ

(Адкрыты ліст да рабочых заводу «Камунар»).

Мы азнаёміліся праз газэту «Зьвязда» ад 26 красавіка з ганебным фактам рвацтва і цкаваньня лепшага ўдарніка на вашым заводзе брыгадай Зільбэрта і прымірэнчых адносін партыйных і прафсаюзных арганізацый заводу да гэтага факту.

Рабочыя-ўдарнікі нашай фабрыкі з абурэньнем чыталі гэты матар'ял. Мы лічым нецярпімым па нашых сацыялістычных прадпрыемствах рвацтва паводзін, тым больш, цкаваньне лепшага ўдарніка за тое, што ён змагаецца за павялічэньне норм выпрацоўкі. Хто гэта не зрагумее, што ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, калі мы канчаем пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі, калі ўзьнімецце прадукцыйнасьці працы на базе скарыстаньня ўсіх тэхнічных магчымасьцяй павінна забясьпечыць выкананьне прамфінпляну, — патрэбен перагляд норм і расцэнак, выходзячы з лепшых прыкладаў работы сапраўдных ударнікаў?

На нашай фабрыцы мы кампанію перагляду норм і расцэнак абгрунтавалі ў палітычную кампанію. Мы абмеркавалі пытаньне перагляду норм па партыйных, камсамольскіх і рабочых сходах, пасьля чаго падрабязна праверылі нормы і расцэнкі кожнай вытворчай камуны і брыгады. Добрая прапрацоўка пытаньня выклікала сустрэчныя павялічаньня нормы па ўсіх працэсах работы. Рэкорд павялічэньня норм паказала вытворчая камуна жанчын-ударніц машыннага цэху па падачы загатован. У выніку перагляду норм мы зьнізілі сабекошт 100 пар абутку на 6 рублёў.

Апрача таго, як вынік масавай прапрацоўкі пытаньня аб перагляндзе норм, 16 лепшых ударнікаў уступілі ў рады партыі.

Мы зьвяртаемся да вас, таварышы камунараўцы. Улічэце наш вопыт. Пераглядайце нормы, арыентуючыся на лепшых ударнікаў, на лепшыя вытворчыя камуны і ўдарныя брыгады. Бярэце прыклад з нашых вытворчых камун, якія добра разгарнулі самакрытыку і сьвядома адносяцца да сваёй работы.

Мы патрабуем ад вас, таварышы камунараўцы:

1. Рашучай барацьбы з рвачамі.
2. Дадатковага перагляду норм па тых працэсах, дзе была ўжыта сьвуляцыя ілжэ-ўдарнікамі, накшталт брыгады Зільбэрта.
3. Абвясьціце разам з намі, што няма месца рвачом, ілжэ-ўдарнікам і сьмулянтам на нашых сацыялістычных прадпрыемствах.
4. Мы патрабуем ад вас безадкладнага пакаранньня вінаватых у цкаваньні ўдарніка тав. Гольдфарба.

Мы ўпэўнены, што вы зьнімеце пляму ганьбы, нанесеную па ваш завод брыгадаю Зільбэрта.

Няхай жыве перамога сапраўднага ўдарніцтва!

Агульны сход рабочых менскай абуткавай фабрыкі.

Сёньня ўсесаюзны дзень праверкі падрыхтоўкі да сяўбы

Саўгасы МЦРК пачалі ворыва

Неадкладна забясьпечыць прыгарадныя гаспадаркі ўсім патрэбным

Пралетары Менску, дапамажэце ЦРК справіцца са сваёй адказнай задачай! У прыгарадных саўгасах не хапае рабочай сілы

1 свабодны дзень павінен аддаць МЦРК кожны рабочы! Гэта—лепшы падарунак 1-му мая

ШТО МЯРКУЕЦЦА ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ

Паводле плянавага заданьня прыгарадных гаспадарак МЦРК павінны засеяць 1200 гэкт. гародных культур, 2000 гэкт. кармовых, 60 гэкт. ягадных і г. д. Апрача таго, павінны быць заложаны 10.500 парніковых рам.

Вось мэта, да якой імкнецца МЦРК, рыхтуючыся да весенавой пасеўнай кампаніі.

Якое становішча мы маем да дня ўсесаюзнага праверкі?

Парніковых рам закладзена каля 9000. Закладка рам крыху спазьнілася. Апошні тэрмін быў 15 красавіка, але перашкодзіла позьняя вясна. Ужо на сёньнішні дзень МЦРК атрымлівае ад парніковай гаспадаркі каля 100 кілё сьвежай парніковай зеляніны, штодзенна. Праз 3 дні закладка парніковых рам будзе скончана. Такім чынам, у гэтай галіне справа стаіць больш-менш добра.

80 ПРОЦ. УГНАЕНЬНЯ ВЫВЕЗЕНА

Гароды яшчэ ня зусім падрыхтаваны. Замест 23.000 тон угнаеньня вывезена толькі 18.500 (80%). Больш паскораная вывазка ўгнаеньняў тармозіцца з-за недахвату транспарту. Аднак, невыкананьне заданьня па вывазцы ўгнаеньня не перашкодзіць пасеўнай кампаніі. Сяўбу мяркуецца правесьці на працягу ўсяго мая месяца. Позьняя культуры (капуста, памідоры, бульба) будуць засеяны ў канцы мая. Да таго часу ўсё ўгнаеньне будзе вывезена.

Невядома, як будзе выкананa заданьне па штучным угнаеньні. Паводле пляну патрэбна быць завезена 770 тон. Атрымана пакуль што 400 тон. Белкавпасаюз абяцае даць і рэшту. Але да якога тэрміну? Калі штучнае ўгнаеньне спозьніцца, прыдзецца дадатково вывозіць гной.

Пасеньнем гаспадаркі амаль забясьпечаны за выключэньнем насеньня гурчакоў, якога не хапае 30%. Не хапае таксама насеньня раньніх бульбы — да 60 проц., але загатоўчы аддзел МЦРК абяцае даць бульбу поўнасьцю, бо да гэтага часу яе нельга было вывозіць з-за холаду.

Інвэнтару і цягавай сілы хопіць. Апрача сваіх уласных 5 трактараў, МЦРК атрымае па 5 трактараў ад Заслаўскай, Койданаўскай і Менскай МТС. Гэта дае гарантыю поўнага вываву ўгнаеньня і ўзмацненьня будаўніцтва, бо дзякуючы трактарам, будзе вызвалена конская сіла.

ЯКІЯ-Ж СЛАБЫЯ МЕСЦЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ?

Першае «вузкае месца» — недхват рабочай сілы. Штатных рабочых патрэбна 800 чалавек, ёсьць 500. Сэзонных патрэбна ў сярэднім 1000 чалавек, ёсьць 150.

Сярод штатных рабочых наглядаецца цякучасьць. Прычыны дзьве: першая, не хапае памяшканьняў для сямейных пастаянных рабочых і другая — гарадзкія арганізацыі не ядуць ніякай барацьбы з цякучасьцю. Зусім амаль няма прафсаюзнай работы. У некаторай часткі рабочых, асабліва тэй, якая прыходзіць в вёскі, моцны яшчэ рвацкія тэндэнцыі. З гэтымі тэндэнцыямі прафарганізацыі не вядзе ніякай барацьбы.

Для сэзонных рабочых памяшканьні ёсьць. Але вербоўка рабочых прахопіць неадвальніючча. Сярод сэзонных каў таксама назіраецца вялікая цякучасьць. МЦРК ужывае ўсе меры, каб стварыць адпаведныя ўмовы для работы. Значна палепшана грамадзкае харчаваньне. У некаторых сталовых (саўгасы «Чырвоны маяк», «Новы сьвет», «Чырвоны транспартнік» і інш.) абеды лепшыя чым у горадзе. Тэрмінова будуюцца інтэрнаты. Вырашаецца рад пытаньняў аб лепшым забясьпечэньні прадуктамі рабочых саўгасаў.

РАБОЧАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ПАВІННА ДАПАМАГЧЫ

Аднак, пакуль што рабочай сілы вельмі мала. Адзіная надзея на грамадзкую дапамогу. Да гэтага часу прадпрыемствы і ўстановы аказалі МЦРК невыстарчальную дапамогу. Колькасьць рабочых дзён па асобных прафарганізацыях і прадпрыемствах, адпрацаваных на карысьць МЦРК, налічваецца адзінкамі і дзесяткамі. Толькі працаўсетнікі, гарбары, мэдработнікі і мэталісты, а таксама школа БВА аказалі МЦРК больш-менш салідную дапамогу рабочай сілай. Іншыя прафарганізацыі не аддаюць гэтай рабоце належнай увагі. Асабліва кепска праходзіць дагаворная кампанія паміж ЦРК і прадпрыемствамі. Ня гледзячы на тое, што кампанія павінна быць скончана да 1 мая, да гэтага дня заключана толькі некалькі дагавораў. Паасобныя фабзаўкомы (завод «Дрэваапрацоўшчык», «Чырвоная зара», «Полымя рэвалюцыі», шчотачная фабрыка, міліцыя) адкладваюць заключэньне дагавораў на час пасьля першамайскіх сьвят. Асобна трэба адзначыць адносіны да гэтага пытаньня старшыні заўкому заводу «Дрэваапрацоўшчык», які вельмі груба спаткаў прадстаўніка МЦРК, адмовіўся пастаўіць дагавор на абмеркаваньне рабочых, тлумачачы гэта тым, што МЦРК ня ідзе яму насустрэч у справе арганізацыі самастойнага закрытага размеркавальніка для заводу (зараз завод «Дрэваапрацоўшчык» карыстаецца разьмеркавальнікам разам з эльводам).

1 ДЗЕНЬ У МЕСЯЦ—АГАРОДНАЙ КАМПАНІІ

Відаць, што і ў гэтай справе бяз штуршка перадавых рабочых прадпрыемстваў, пепшых ударнікаў — не абыйдзецца. Дагаворная кампанія павінна быць скончана не пазьней 1 мая, каб даць магчымасьць рабочым фабрык і заводаў Менску прыняць актыўны ўдзел у весенавой сяўбе.

Паводле разьлікаў МЦРК кожны рабочы павінен аддаць 6 сваіх дзён адначынку — па 1 дні ў месяц — у дапамогу прыгарадным гаспадаркам. Толькі такім удасца МЦРК вывесьці з крызісу з рабочай сілай. Гэту дапамогу пралетары Менску павінны аказаць. Пасьпяховае правядзеньне гародняй кампаніі значна палегчыць недахват гародніны для забясьпячэньня рабочых і іх сем'яў.

НЕ ХАПАЕ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ

Вельмі марудна ідзе новае будаўніцтва ў прыгарадных гаспадарках. Аспоўная прычына — недахват будаўнічага матар'яду. МЦРК павінен атрымаць ад Гражданскага лесазаводу 240 куб. мэтраў піламатар'ялаў. Пакуль не даюць вагонаў. Са станцыі Негарэлае трэба атрымаць 3000 куб. мэтраў круглякa, з іх 2000 пойдуць на завод «Дрэваапрацоўшчык» для расьпілоўкі. Але і тут вагонаў пакуль няма. Не хапае гонтаў: замест 13 тысяч коп атрымана толькі 2000, хоць ёсьць парад на атрыманьне 5000.

Зараз усе будаўнічыя сілы і сродкі кінуты на скарачэньне інтэрнатаў для рабочых. Іншае будаўніцтва будзе разгорнута толькі пасьля атрыманьня лесаматар'ялаў.

ЗАПАС КАРМОЎ НА 2-3 ДНІ

Трэцяе «вузкае месца» гэта недахват кармоў. Грубых кармоў ёсьць запас усяго на 2-3 дні. З моцных кармоў (авёс, вотрубі) амаль нічога няма. Белкаапсаюз і Саюзхлеб абмяжоўваецца толькі абяцанкамі. Недахват кармоў можа адбіцца на пармальнай рабоце коняй, ня кажучы ўжо аб тым, што ад недахвату кармоў церпяць малочныя фэрмы. Каровы, якія павінны даваць штодзенна 18-20 літраў малака, даюць ня больш 4-5 літраў.

Белкаапсаюз і Саюзхлеб павінны зрабіць усё магчымае для паслаблення кармавога крызісу.

НІ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ, НІ ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ

Да недахопаў работы самога ЦРК і яго сельска-гаспадарчага аддзелу трэба аднесьці тое, што прыгарадныя гаспадаркі да гэтага часу не пераведзены на зьдзельшчыну, нічога ня робіцца для ўкараненьня гаспадарчага разрахунку. У гэтым напрамку ніякага кіраўніцтва ад Белкаапсаюзу няма. Апошні ня даў ніякіх установак па пытаньнях зьдзельшчыны, гаспадарчага разрахунку, нічога не зрабіў для стандартызацыі будаўніцтва (кожны ЦРК будзе інтэрнаты, сьвінарнікі, фэрмы і г. д. паводзе сваіх уласных праектаў; не распрацаваны найбольш мэтазгодныя праекты).

Вось баланс падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі. Калі тры аспоўныя «вузкія месцы» (рабочая сіла, будматар'ялы, кармы) будуць ліквідаваны, — посьпех гароднай кампаніі гарантаваны.

«ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ», ТВАЕ ПЛУГІ!

26 красавіка саўгасы «Новы сьвет» і «Чырвоны маяк» пачалі ворыва. Аднак, першы дзень у саўгасе «Чырвоны маяк» быў няўдалы. З 10 двухлямешных плугоў, якія выехалі араць, 7 плугоў яшчэ да абедзенага перапынку вышлі са строю. У іх здламаліся адвалы. Гэта сьведчыць аб вельмі «добрай якасьці» рабоце машына-будаўнічага заводу «Чырвоны мэталіст». Калі далей так пойдзе, дык прыгарадныя гаспадаркі засталуцца без інвэнтару.

Пробныя выезды ў сагасах «Вольная праца» і «Чырвоны транспартнік» паказалі, што яны да сяўбы поўнасьцю падрыхтаваны.

Пасеўная кампанія ў прыгарадных гаспадарках пачалася. Адказныя заданьні па забясьпячэньні рабочых і іх сем'яў гароднінай павінны выклікаць у рабочай грамадзкасьці пільную ўвагу да ходу пасеўнай кампаніі. Дзень праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы павінен стаць пачаткам больш актыўнай дапамогі МЦРК з боку пралетарскай грамадзкасьці.

П.

РОЛЯ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ НЯ ВЫЧЭРПВАЕЦЦА ПАДПІСАНЬНЕМ ГЕНЭРАЛЬНЫХ ДАГАВАРОЎ

Яны абавязаны арганізаваць практычную дапамогу заводам

ВЫКРЫВАЦЬ ТЫХ, ХТО Ў ФОРМУ ДАГАВОРУ НЯ ЎКЛАДВАЕ КАНКРЭТНАГА ЗЬМЕСТУ, ХТО БЮРАКРАТЫЗУЕ ДАГАВОРНУЮ КАМПАНІЮ

Афіцыяльны тэрмін дагаворнай кампаніі скончыўся. Да 25-га красавіка ўся прамысловасьць ВСНГ БССР павінна была закончыць заключэньне дагавораў.

Па тых выніках, якія сараз ёсьць, увага да дагаворнай кампаніі ўзмацнілася толькі ў апошні час, калі пераважная частка пасыўна наглядаючых з боку гаспадарнікаў пераканалася ў абсалютнай неабходнасьці афармленьня ўзаемаадносін дагаварамі і ўявіла надзвычай важны гаспадарча-палітычны сэнс гэтага кроку.

Ёсьць даволі значны ахоп дагаворамі аб'яднаньняў. У значнай ступені ахоплены дагаварамі галоўныя збытавыя і забясьпячэньчыя ўзаемаадносіны. Але трэба адзначыць, што рад аб'яднаньняў да гэтага часу ня маюць дагавораў, нават на асноўныя віды матар'яльнага забясьпячэньня, а таксама на збыт сваёй прадукцыі.

Адначасова з гэтым у радзе выпадкаў заключэньня дагавораў зацягвалася рэдкалегіі сазаных аб'яднаньняў (Стальзбыт, Мэтэзбыт аб'яднаньне, Саюзхлеб), якія, спасылаючыся на адсутнасьць адпаведных інструкцый ад сваіх цэнтраў, адмаўляліся ад заключэньня дагавораў пры тэй умове, калі будуць уключаны ў іх пункты аб тэрмінах пастаўкі і матар'яльнай адказнасьці.

Паводле даных на 21 красавіка, усяго па рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ БССР (за выключэньнем тэкстыльнай) заключана 140 дагавораў на забясьпячэньне і збыт на агульную суму каля 136 м. р. З гэтай колькасьці 51 дагавор на суму 58 м. р. заключаны аб'яднаньнямі, з якіх на забясьпячэньне — 33 на суму 25 м. р. і на збыт — 18 на суму 33 м. р.

Непасрэдна прадпрыемствамі заключана 88 дагавораў на суму ў 78 м. р. З іх заключана па забясьпячэньне 40 дагавораў на суму — 29 м. р. і на збыт— 48 на суму 49 м. р.

Па асобных аб'яднаньнях якасьць і аб'ём працы рознастайныя. Па радзе аб'яднаньняў дагаворная кампанія ахапіла амаль што поўнасьцю як забясьпячэньне, так і збыт, але ёсьць аб'яднаньні, якія да гэтага часу ганебна адстаюць.

У аспоўным як па матар'яльным забясьпячэньні, так і па збыце прадукцыі ахоплены дагаварамі Скураб'яднаньне, Хэмаб'яднаньне, Паліграфаб'яднаньне, Мэталлаб'яднаньне, Будаб'яднаньне і Швэйаб'яднаньне ў частцы, якая датычыць непасрэдна аб'яднаньняў.

Не заключаны дагавары па асноўным сырцы і матар'ялах, а таксама па збыце прадукцыі Запалкаб'яднаньнем і Шклаб'яднаньнем.

Па мэталлаб'яднаньні да гэтага часу затрымліваецца афармленьне дагавораў па збыце прадукцыі. Асноўныя дагаворы з Будмэханізацыяй, Сельгасснабам і «Союзстанкоинструментом» не заключаны.

Ёсьць яшчэ рад аб'яднаньняў, якія да гэтага часу не заключылі вельмі важных дагавораў як на забясьпячэньні асноўным сырцом і матар'ялам, так і па збыце прадукцыі. Гэта таварыць аб невыстарчальнай увазе гэтаму пытаньню, аб адсутнасьці патрэбных тэмпаў.

У найкарацейшы тэрмін гэтыя хібы павінны быць рашучым чынам зьлікві́даваны.

Трэба адзначыць, што адным з адмоўных момантаў ужо праведзенай работы зьяўляецца тое, што дагаворная кампанія па сутнасьці яе ахапіла непасрэдных пастаўшчыкоў і спажыўцоў—прадпрыемствы БССР. Толькі па меншасьці аб'яднаньняў гэта работа ў асноўным праведзена здавальняюча. Скураб'яднаньне, Паліграфаб'яднаньне, Мэталлаб'яднаньне і часткова Хэмаб'яднаньне ў гэтай справе ідуць першымі. Можна лічыць, што па Скураб'яднаньні работа праведзена добра. Дагаворная кампанія амаль што закончана, прычым у дагаворную сыстэму па гэтым аб'яднаньні ўцягнуты ўсе прадпрыемствы—адных дагавораў паміж прадпрыемствамі ў парадку вытворчага каапэраваньня заключана на суму звыш 14,5 м. р.

Па Паліграфаб'яднаньні заключаны дагаворы на друкарніях і шпалерная фабрыцы.

Па Белмэталлаб'яднаньні заключаны дагаворы з голкавай фабрыкай як па забясьпячэньні дротам, так і па збыце іголак, а рэштай заводаў—імя Варашылава, «Камунар», акулярная, «Чырвоны мэталіст», імя Сталіна і «Інтэрнацыянал» заключаны дагаворы толькі на збыт сваёй прадукцыі.

Па іншых аб'яднаньнях прадпрыемствы не мабілізаваліся на безадкладную барацьбу за дагавор.

Асабліва адстаюць прадпрыемствы мясцовай прамысловасьці. Дагаворная кампанія амаль што прайшла міма іх, закранула толькі найбольш буйныя камбінаты, прамтрэсты і іх прадпрыемствы.

Галоўнай задачай зараз зьяўляецца ўзмацненьне тэмпаў правядзеньня дагаворнай кампаніі з тым, каб усе гаспадарчыя адносіны паміж прадпрыемствамі пранізаць адпаведнымі дагаворамі.

Трэба ўсім прадпрыемствам, ня скончыўшым гэту работу, безадкладна ўключыцца ў барацьбу за дагавор, за афармленьне сваіх узаемаадносін.

Трэба памятаць, што з 1-га мая Дзяржбанк уводзіць новую сыстэму крэдытаваньня, і тое прадпрыемства, якое ня будзе мець дагавораў, ня зможа атрымаць адпаведных крэдытаў. Прадпрыемствы і гаспадарчыя органы, якія не заключаць дагавораў, паставяць сабе пад пагрозу перабоў у фінансаваньні і адказнасьць за гэта ляжа поўнасьцю на іх кіраўнікоў.

Адначасова з афармленьнем яшчэ не заключаных дагавораў трэба правесьці праверку і адпаведнае выпраўленьне тых заключаных дагавораў, якія ня прадугледзелі ўсіх патрэбных пунктаў.

З прычыны фармальнага падыходу некаторых аб'яднаньняў да заключэньня дагавораў, зьмест апошніх вельмі ня выразна вызначае ўмовы дагавору (колькасьць і сума пастаўкі, тэрміны выканаьня, адказнасьць за невыкананьне абавязацельстваў і г. д.).

Паводле некаторых дагавораў, адказнасьць за выкананьне ўскладаецца толькі на аднаго контр-агента.

Неканкрэтныя і аднабаковыя дагаворы толькі перашкаджаюць правільнай арганізацыі сыстэмы гаспадарчых адносін у галіне забясьпячэньня і збыту. Яны па сутнасьці змазваюць ўвесь гаспадарча-палітычны сэнс кампаніі, якая праводзіцца.

Аб'яднаньні і прадпрыемствы, якія ўжо заключылі дагаворы па забясьпячэньні і збыце сваёй прадукцыі, павінны да 1-га мая прагледзець іх з тым, каб уключыць там, дзе няма, пункты аб сумах, тэрмінах пастаўкі і адказнасьці за невыкананьне, кіруючыся пры гэтым адпаведнымі тлумачэньнямі і загадамі ВСНГ.

Трэба мець на ўвазе, што Дзяржбанк ня будзе адкрываць крэдыты на дагаворох, якія ня будуць мець паказаных канкрэтных пунктаў.

Аб'яднаньні павінны дапамагчы больш адсталым прадпрыемствам тэрмінова закончыць заключэньне дагавораў.

Ніякіх адтэрмінаваньняў у правядзеньні новай формы крэдытаваньня ня будзе. Неабходна мабілізацыя сіл сіл на сваячасовае скончэньне кампаніі.

Крэдытаваньне пад «плян» 1-га мая будзе скончана.

Самахвалэў.

Усебеларускі зьезд рабселькораў

СУСТРЭЦЬ ВЫКАНАНЬНЕМ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕМ ПРАМФІНПЛЯНУ, АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВЫХ КАЛГАСАЎ, УДАРНЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ

Рашуча перабудаваць работу газэт і рабселькораў на падставе пастаноў усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху

Па-баявому сустрэць усебеларускі зьезд рабселькораў

ЦК КП(б)Б, зацьвярджаючы мерапрыемствы Культпропу ЦК па правядзеньні масавага агляду-самаправеркі работы нізавога друку і рабселькораў і партыйнага кіраўніцтва ім, абавязаў «усе таркомы, райкомы КП(б)Б і рэдакцыі газэт правесьці гэты масавы агляд-самаправерку пад кутом яшчэ большага павышэньня ролі і месца нізавога друку ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну і за другую бальшавіцкую вясну, за новы ўздым магутнай хвалі далейшага калгаснага прыліву, а таксама за ня́хуільнае ажыцьцяўленьне лёзунгу рабселькораўскага руху аб тым, што «кожны рабселькор — ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор».

Самаправерка, перавыбары рэдкалегій, падрыхтоўка да дня друку, да Усебеларускага зьезду рабселькораў павінны быць непарыўна, самым шчыльным чынам зьвязаны з узмацненьнем непасрэднай барацьбы газэты і рабселькораў за выкананьне ўсіх асноўных гаспадарча-палітычных задач.

Надрукованыя сёньня матар'ялы сьведчаць аб апартуністычнай стаўцы дзе-ні-дзе на самацёк, на перавараньне масавага агляду ў «габінэтнае» абсьледваньне. Мы яшчэ раз падкрэсьліваем, што агляд-самаправерка і перавыбары рэдкалегій зьяўляюцца масавай палітычнай кампаніяй, і ўсякім фактам дазвалякага падыходу, недаацэнкі гэтай важнейшай справы трэба даваць рашучы адпор.

Рабселькоры БССР павінны сустрэць свой усебеларускі зьезд выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну, арганізацыяй новых соцень калгасаў, пераводам існуючых калгасаў на дешную арганізацыю працы па прынцыпе зьдзельшчыны, рашучай перабудовай работы газэт і рабселькораў на падставе пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і Усесаюзнай рабселькораўскай нарады.

Раўняйцеся па лепшай

Насьценгазэта полацкай цэгельні—сапраўдны барацьбіт за прамфінплян

Пры Полацкім РВК ужо больш 6 месяцаў ня выходзіць насьценгазэта. З тэй пары, як ліквідаваліся акругі, працаўнікі РВК насьценгазэты і ня бачылі. Раней насьценгазэта выдавалася пры кожнай установе. Зараз газэты пры ўстановах ня выходзяць.

Тым часам на радзе прадпрыемстваў Полацку газэты добра працуюць. Насьценгазэта полацкай цэгельні зьяўляецца актыўным барацьбітом за прамфінплян. Яна ўвесь час асьвятляе выкананьне прамфінпляну і ва ўдарным парадку праводзіць падрыхтоўку да будаўнічага сэзону, своячасова сыпалізуе аб момантах зрыву ў будаўніцтве.

Як самы добры прыклад, трэба адзначыць тое, што газэта дабілася рэагаваньня на зьмешчаныя заметкі. У кожным нумары насьценгазэты адміністрацыя і заўком даюць водгукі на заметкі і што па іх зроблена. Насьценгазэта выходзіць рэгулярна. Насьценгазэта пры цагельні зьяўляецца ініцыятарам ударнага руху і сацспаборніцтва на заводзе.

Да гэтага часу партыйныя ячэйкі Полацку не заняліся пытаньнем кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі. У часе самаправеркі друку гэтыя недахопы трэба выпрывіць і дабіцца, каб кожны калгас, саўгас, прадпрыемства і ўстанова мелі сваю насьценгазэту.

ЯЗЭП САЎЧАНКА.

Прафсаюзы павінны ўключыцца

(Пастанова ЦСПСБ аб рабоце прафсаюзаў па папулярызацыі пастаноў усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху, перавыбараў рэдкалегій насьценгазэт і скліканьні ўсебеларускага зьезду карэспандэнтаў)

Надаючы вялізарнае палітычнае значэньне задачам далейшага ўзмацненьня рабселькораўскага руху, неабходнасьці яшчэ большай мабілізацыі друку, а праз яго і ўсёй рабочай грамадзкасьці на выкананьне заданьняў пяцігодкі за чатыры гады і трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на перабудову прафсаюзнай работы тварам да вытворчасьці, да канкрэтнага кіраўніцтва прамысловасьцю і сацыялістычнай перабудовай сельскай гаспадаркі—прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім ЦП саюзаў, гар і райпрафсаветам і ФЗМК уключыцца ў работу, якая праводзіцца партыйнымі арганізацыямі па самаправерцы работы насьценгазэт і па перавыбарах рэдкалегій, разгарнуць яе, як масавую палітычную кампанію, цесна ўвязаўшы з пытаньнем гаспадарча-палітычнага жыцьця прадпрыемства і задачамі вытворчасьці і з папулярызацыяй пастаноў Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

2. Прапанаваць ЦП саюзаў па Менску, гар і райпрафсаветам абгаварыць на прафактывах пытаньні кампаніі, папярэдня прапрацаваўшы іх на цэхавых, зьменавых сходах, нарадах заводзкага актыву і рабселькораў.

3. Скарыстаць усе віды масавай работы (гутаркі, плякаты, лёзунгі, насьценгазэты, вечары, палітбой і г. д.) для папулярызацыі задач паляпшэньня і прыцягненьня да ўдзелу ўсіх рабочых, дабіваючыся выкананьня лёзунгу: «Кожны ўдарнік—рабселькор, кожны рабселькор—ударнік».

4. ФЗМК забясьпечыць удзел прафарганізацый у самаправерачнай рабоце рэдкалегій, прымаючы ўдзел і дапамагаючы арганізаваць самаправерачныя брыгады, праверку выкананьня дырэктыў партыі і прафсаюзаў аб рабселькораўскім руху і аб друку, аб рэагаваньні на рабселькораўскія артыкулы, барацьбе з беспадстаўным «абвяржэньнем», а заціскам самакрытыкі.

5. Прапанаваць ФЗМК устанавіць разам з партарганізацыяй заводаў тэрміны рэгулярнага выпуску насьценгазэт (ня менш 2-х раз у месяц) і зьмены заметак у «Ільлічоўках» (ня больш, як праз 15 дзён ад часу апублікаваньня), дапамагаючы наладзіць плянавасьць у сыстэме матар'ялаў, разгарнуўшы сетку насьценгазэт так, каб кожная зьмена, кожны цэх, пабудова, саў

Да прыезду Максіма Горкага ў СССР

Грамадзкасьць Савецкай Беларусі з бязьмернай радасьцю сустрэне вялікага пісьменьніка

Спатканьне на мяжы

(1928 год)

Я памятаю дзень, калі была запоўнена плошча, вакзал і перон прадстаўнікамі ад фабрык, заводаў і арганізацый. Наш зводны эскадрон стаяў там, дзе павінен быў спыніцца вагон, у якім прыедзе Горкі.

Чырвонаармейцы вельмі ўважліва слухалі тое, што я ім расказваў аб Горкім.

— Дык чаму-ж ён ня жыве ў нас? —спытаўся ў мяне баец Шапятоў у адказ на мае словы аб тым, што Горкага любяць, што такія-ж спатканьні, як у нас у Менску, будуць на ўсім СССР.

— Эх, галава,—адказаў яму чырвонаармеец 4-га эскадрону Дзегцяроў, —дык ён-жа хворы.

— Эх, калі-б здаровы быў...

Зваду шумелі дэлегацыі, целі песьні, чакалі калі пакажуцца агні курэрскага.

Палова эскадрону разьйшлася па пероне, ля кожнага чырвонаармейца штурхалася групка ў 5-10 чал. рабочых, камсамольцаў. Тут можна было ўбачыць тую ўвагу, з якою працоўныя адносяцца да сваёй арміі.

Перон быў заліты сьвятлом. Вясёлыя твары байцоў былі поўныя нецярплівасьці ў чаканьні цягніка.

— Таварышы, стройся, бяроце прыклад з чырвонаармейцаў. З-за дэпо вырваліся з цемры тры вялікія вока.

Перон застыў. Погляды ўсіх былі вакіраваны на маленькі клясны вагон.

Калі цягнік пачаў спыняцца, у трэцім акне апошняга вагону працягнуліся наперад чыесьці рукі, патрасаючы імі, чалавек штосьці таварыў, гледзячы на натоўп, на вакзал, па горад.

— Горкі. Горкі,—загуў перон.

Патанулі аркестры ў крыках «ура» і ў прывітаньнях.

— Няхай жыве Горкі!

— Няхай жыве пралетарскі пісьменьнік Максім Горкі!

— Прывітаньне Горкаму!

«Гучнае чырвонаармейскае «ура» магутнай хваляй пракацілася па пероне. Горкі мятусіўся ў акне. Гэта спатканьне вельмі ўсхвалявала яго.

Ён хацеў ахапіць поглядам усіх, але канца стройных калён ён ня мог бачыць.

У вагон увайшлі прадстаўнікі ЦК кампартыі Беларусі, ураду БССР і прафсаюзаў.

Горкі горача паціскаў ім рукі.

Калі ля дзьвярэй зьявіўся Горкі, калёны хлынулі да вагону.

Пачаўся мітынг.

Пасьля прывітаньняў ад ЦК партыі, СНК і ЦВК БССР, слова прадаставілі рабочаму-чыгуначніку—Галаскоку.

«У гады разбурэньня цягнікі, набітыя пралетарамі і беднякамі, поўныя гора людзкога—вострая народная размова назвала тваім імем—«Максімам Горкім». Гэта было калісьці. Цяперка мы называем тваім імем нашы лепшыя пралетарскія цягнікі, на якіх мы на ўсіх парах імчымся па шляху да сацыялізму».

Ад імя менскага гарнізону слова прадаставілі мне.

Я не магу дакладна ўспомніць сваю прамову, але я добра памятаю, што мая прамова, як прамова прадстаўніка Чырвонай арміі,—усхвалявала Горкага.

Вітаючы Горкага, я перадаў жаданьні нашай арміі:

«Знаёмячыся з жыцьцём нашай вялікай краіны, пазнаёмся Горкі з жыцьцём і бытам рэвалюцыйных будняў гэраічнай арміі пралетарыяту, з жыцьцём тэй арміі, якая ў любую хвіліну гатова найсьці ў бой за сваю краіну, за справу сусьветнага пралетарыяту».

Калі пачалі сьціхаць гукі аркестраў, Горкі працягнуў мне абедзьве рукі. Я моцна паціснуў вялікую руку Горкага.

— Колькі вам год?

— 24,—адказаў я.

— А колькі год вы ў арміі?

— Дзявяты год.

— Дзявяты год у арміі і такі малады?

Ударыў звон, рвануў паравоз. Горкі, акінуўшы узрокам натоўп працягваючы рукі, разьвітаўся з пралетарамі гораду Менску.

Доўга сьледам чырвонаму, утапаўшаму ў цемры агончыгу, глядзелі тысячы вачэй.

У радох эскадрону ішла гутарка аб Горкім чырвонаармейцы ўспаміналі рысы яго твару і скромную прамову, у якой ён сказаў:

— Таварышы, я гаварыць не магу, я ўжо лепш напішу.

Вількабрыскі.

Прыезд Максіма Горкага чакаецца сёньня ўвечары

— У МЕНСКУ НАЛАДЖВАЕЦЦА МАСАВАЯ СУСТРЭЧА ВЯЛІКАГА ПРАЛЕТАРСКАГА ПІСЬМЕНЬНІКА.

— БУДЫНАК МЕНСКАГА ВАКЗАЛУ АЗДАБЛЯЕЦЦА Ў ГОНАР ПРЫЕЗДУ ГОРКАГА СЬЦЯГАМІ, АДПАВЕДНЫМІ ЛЁЗУНГАМІ, ПАРТРЭТАМІ «БУРАВЕСЬНІКА РЭВАЛЮЦЫІ» І ЦЫТАТАМІ З ЯГО ЛІТАРАТУРНА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ ТВОРАЎ. ПЛЯЦ ЛЯ ВАКЗАЛУ І ПРЫЛЕГЛЫЯ ВУЛІЦЫ ШЫРОКА РАДЫЁФІКАВАНЫ.

— БЕЛДЗЯРЖКІНО ВЫЗНАЧЫЛА СПЭЦЫЯЛЬНУЮ БРЫГАДУ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ КІНО-ЗДЫМКАЎ СПАТКАНЬНЯ **МАКСІМА ГОРКАГА** Ў НЕГАРЭЛЫМ І Ў МЕНСКУ.

— УЧОРА АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ГРАМАДЗКАГА КАМІТЭТУ ПА СПАТКАНЬНІ НА СТ. НЕГАРЭЛАЕ І Ў МЕНСКУ МАКСІМА ГОРКАГА.

ЯК ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПРЫЕЗДУ ГОРКАГА, ТАК І ПРАВЯДЗЕНЬНЮ СПАТКАНЬНЯ БУДЗЕ НАДАН МАСАВЫ, ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНЫ ХАРАКТАР.

— НА **СТ. НЕГАРЭЛАЕ** ВЫЯЖДЖАЕ ДЭЛЕГАЦЫЯ КАЛЯ 20 ЧАЛ. Ў СКЛАДЗЕ ДЭЛЕГАЦЫІ—РАБОЧЫЯ-ЎДАРНІКІ З БРЫГАДЫ ІМЯ ГОРКАГА (ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА), ПІСЬМЕНЬНІКІ (АД УСІХ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ), ПРАДСТАЎНІКІ БАН, СЭКЦЫІ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ, НАРКАМАСЬВЕТЫ, ПРАФСАЮЗАЎ І КАМСАМОЛУ. У ЯКАСЬЦІ СПЭЦЫЯЛЬНЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ ВЫЯЖДЖАЮЦЬ ПРАДСТАЎНІКІ ПЯЦІ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ.

— У МЕНСКУ Ў ЧАСЕ ПРЫЕЗДУ З НЕГАРЭЛАГА КУРЭРСКАГА ЦЯГНІКА, У ЯКІМ БУДЗЕ ЕХАЦЬ МАКСІМ ГОРКІ, НАЛАДЖВАЕЦЦА ЛЯТУЧЫ МІТЫНГ. ВЯЛІКАГА ПІСЬМЕНЬНІКА—БАЙЦА СПАТКАЮЦЬ НА ПЭРОНЕ ЧЛЕНЫ ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР, СНК, ЦК ЛКСМБ, ПРАДСТАЎНІКІ НАВУКОВЫХ ІНСТЫТУТАЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ, ГАРКОМУ ПАРТЫІ, ГАРПРАФСАВЕТУ, РАБОЧЫЯ ДЭЛЕГАЦЫІ.

Напярэдадні 1 мая

Прадпрыемствы Менску да першамайскіх сьвят

У гутарцы з нашым супрацоўнікам старшыня гараднога савету прафсаюзаў — тав. **Шулькін** паведаміў наступнае:

На прадпрыемствах Менску падрыхтоўка да 1-га мая ідзе поўным ходам. Расьце хваля сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

За апошні час на заводзе «Камунар» арганізаваны 4 новыя ўдарныя брыгады імя-«518» і «1040» і імя VII-га зьезду прафсаюзаў БССР.

Для праверкі, як прадпрыемствы рыхтуюцца да 1-га мая і да другой гадавіны сацспаборніцтва і ўдарніцтва, гарпрафсавет арганізаваў спэцыяльныя брыгады.

28-га красавіка прэзыдыум гарсавету прафсаюзаў заслухае справаздачу прадпрыемстваў аб іх падрыхтаванасьці да дня пралетарскай салідарнасьці.

30-га красавіка ўсе кіно, тэатры і клюбы будуць перададзены ў распараджэньне буйнейшых прадпрыемстваў Менску для правядзеньня ўрачыстых вечароў. На апошніх падводзяцца вынікі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, абмяркоўваюцца задачы барацьбы за прамфінплян 3-га рашаючага году пяцігодкі. На гэтых вечарох адбудзецца таксама прэміяваньне лепшых ударнікаў.

30-га красавіка вечарам па пляну Волі і ў аснoўных пралетарскіх раёнах будуць устаноўлены кіно-перасоўкі.

1-га мая ўсе кіно і тэатры даюць бясплатныя пастаноўкі для членаў прафсаюзаў.

У першамайскія сьвяты рабочыя менскіх заводаў і фабрык высылаюць сваіх прадстаўнікоў у калгасы і саўгасы. Калгаснікі і саўгаснікі прысылаюць сваіх прадстаўнікоў на прадпрыемствы.

2-га мая ў некаторых прыгарадных сельсаветах арганізуюцца пробныя выезды ў поле.

Май—ударны месячнік лоўлі

1-га і 2-га мая—усесаюзны суботнік на пуціне

У сувязі з прарывам у выкананьні параённых плянаў лоўлі сумеснае пасяджэньне праўленьня Саюзрыбы, Усекамрамрыбаксаюзу, Усесаюзнага палаўнічага саюзу, прэзыдыумаў ЦК саюзаў, волнікаў і рабочых мяса-рыбнай і кансэрвовай прамысловасьці пастанавіла абвесьці май ударным месячнікам пуціны.

Ударны месячнік пачынаецца 1-га мая. 1-га і 2-га мая праводзіцца ўсесаюзны суботнік. Усе лаўцы павінны быць на рабоце, бо гэтага патрабуюць гаспадарчыя інтарэсы краіны. У часе ўдарнага месячніка пуціны рыба-гаспадарчыя арганізацыі павінны даць краіне 7 мільёнаў цэнтнараў рыбы, з іх на долю БССР прыходзіцца 6 тыс. цэнтн. рыбы.

Для выкананьня гэтага заданьня на мясцох лоўлі павінны быць створаны кантрольныя пасты па праверцы выканаьня пляну ўдарнага месячніка. Неабходна арганізаваць грамадзкую дапамогу рыбаку-калгаснику і аднаасобніку, наладзіць кантроль за выкананьнем дагавораў па сацспаборніцтве паміж калгасамі і паасобнымі промысламі.

Прафарганізацыі павінны разгарнуць на ўсіх промыслах масавую работу па ўзьнаўленьні працдысцыпліны, барацьбе з прагуламі, павышэньні якасьці прадукцыі і скарыстаньні ўсіх адкідаў.

Уся работа павінна праходзіць пад лёзунгам—100 проц. ахопу рабочых сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Не пазьней 1-га мая павінна быць праведзена кантрактацыя прадукцыі рыбакоў—поўпрамыслоўцаў. Рыбакі-аднаасобнікі, якія не здалі закантрактаванай рыбы і прадалі яе на вольным рынку, павінны прыцягвацца да судовай адказнасьці.

Рыхтуюцца па-баявому

МАЗЫР. (Наш кар.). На фабрыцы «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» шырока разгорнута падрыхтоўка да першамайскіх сьвят. Фабрычны камітэт выпучыў спэцыяльную брыгаду з 12 чал. для правядзеньня падрыхтоўчай работы. У падрыхтоўку ўцягнуты шырокія масы рабочых.

1-га мая склікаецца канфэрэнцыя ўдарнікаў фабрыкі, на якой будуць абмеркаваны вынікі выкананьня фабрычнага прамфінпляну і далейшыя задачы. На канфэрэнцыі будуць таксама прэміяваны лепшыя ўдарнікі.

У клюбе дзвеапрацоўшчыкаў адбудуцца ўрачыстыя вечары, прысьвечаныя першамайскім сьвятам і гадавіне сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Я. Л.

Пяцігодку за 2½ гады

выканала гомельская электрастанцыя імя 5-ай гадавіны Кастрычніка

ГОМЕЛЬ (НАШ КАР.). Ва ўрачыстую перакліпчку прадпрыемстваў, якія скончылі пяцігодку за 2½ гады, уключаецца гомельская электрастанцыя імя 5-й гадавіны Кастрычніка.

Паводле пяцігадовага пляну была запраектавана пабудова трох агрэгатаў па 1.500 кілёват кожны. Урадавай камісіяй магутнасьць была павялічана да 5.000 кілёват. Гэта **ЗАДАНЬНЕ ЎЖО ЗАРАЗ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАНА.**

Валавая прадукцыя да канца пяцігадовага пляну **ПАВІННА БЫЛА БЫЦЬ ДАВЕДЗЕНА ДА 12.796.000 КІЛЁВАТ-ГАДЗІН,** а ўжо ў трэцім годзе пяцігодкі **ВЫПРАЦОЎКА ДАВЕДЗЕНА ДА 15.695 ТЫС. КІЛЁВАТ-ГАДЗІН.**

Выпрацоўка аднаго рабочага да канца пяцігодкі паводле пляну павінна была раўняцца 13.458 руб., а да 1-га студзеня 1931 году выпрацоўка даходзіць ужо да 10.008 руб і з пускам трэцяга агрэгату выпрацоўка перавысіць намячэньні пяцігадовага пляну.

Паводле пляну сабекошт па электраэнэргіі павінен быць зьніжан на 55,5 проц. Гэта ўжо дасягнута ў асобным квартале. Зараз прымаюцца меры да далейшага зьніжэньня сабекошту.

Пяцігадовым плянам вызначылася давесьці фонд накапленьня да 137 руб. і па эмартызацыі на 185.000 руб., што складае разам 332.000 руб. Гэта яшчэ перавыкананa ў першым годзе пяцігодкі—443.780 і за адзін асобны квартал накапленьне складае 185.000 руб.

Выканан плян і па эканоміі вугалю. Да пачатку пяцігодкі выдатак апалу складаў на 1 кілёват-гадзіну 1,72 кгр., у 1930 годзе выдатак зьнізіўся на 1,53 кгр., а ў асобным квартале выдатак зноў зьнізіўся да 1,40 кгр.

Такім чынам, усе асноўныя паказальнікі, якія даказваюць выкананьне праграм, ёсьць. Праўда, ёсьць большы лік рабочых і служачых у параўнаньні з вызначаным планам, але гэта тлумачыцца тым, што зараз праводзяцца мантажныя работы, пасьля сканчэньня якіх лік рабочых і служачых будзе даведзен да лічбаў пляну. Гомельская электрастанцыя ўступае ў паласу новых заданьняў звыш пяцігодкі.

1-га мая электрастанцыя адзначае і другой перамогай—пераходзіць на 7-гадзінны рабочы дзень.

Б. Зэльманаў.

Наркампрацы ўключыўся ў праверку

Наркампрацы БССР пастанавіў уключыцца ў генэральную праверку падрыхтоўкі да сплаву, арганізаваную «Правдой». Адпаведныя ўказаньні даны гарадзкім і раённым інспэктарам працы. У Мазыр, Гомель, Віцебск і Бабруйск пасылаюцца інструктары НКП для дапамогі ў правядзеньні сплаву. Пытаньне аб праверцы абгаворана на агульным сходзе ячэйкі і ўсяго калектыву НКП.

Наркампрацы дагэтуль заключыў дагавары на 14.000 плытагонаў. Патрэбны 17.000 чал.

Найбольш дрэнна стаіць справа па Бабруйскай сплаўной канторы, якая забясьпечана рабочай сілай толькі на 20 проц. Канторы прапанавана завезьці 2.000 рабочых з Украіны. Патрэбы экспартнага сплаву ў рабочай сіле забясьпечаны поўнасьцю. Мабілізаваны на сплаў 10 гідра-тэхнікаў і 10 дзесятнікаў, а таксама 30 проц. работнікаў леспрамгасаў.

Штаб па дапамозе сплаву пры НКП пастанавіў паслаць на пункты сплаву 5 чал. ад НКП, 30 ад Лесбелу, 5 ад ЦП саюзу лесдрэўрабочых і 9 ад Белкаапсаюзу. Штаб зьвярнуўся ў ЦК ЛКСМБ з просьбай мабілізаваць на сплаў 500 камсамольцаў.

Наркампрацы СССР прапанаваў НКП БССР мабілізаваць усе сілы для выкананьня пляну сплаву і забясьпечыць сплаў на 100 проц. патрэбнай рабсілай.

На сплаве ў часе паводкі

Ідзе напружаная работа па ўмацаваньні румаў

Рака Заходняя Дзьвіна

24 красавіка паводкай унесена з Бешанковіцкай сплаўнай прыстані 2.000 бярвеньняў. 900 шт. злоўлены ў Вуле, устаноўлены пункты для перахвату зьнесенай драўніны.

Полацкі лесапільны завод затоплен і не працуе ўжо двое сутак.

25 красавіка расплыўся рум «Балотні», Боркавіцкага леспрамгасу. Унесена каля 3.000 шт. Даны тэлеграмы сплаўным пунктам затрымаць уплыўшы лес. Прыстані бесьперапынна ўмацоўваюцца. Работнікі леспрамгасаў працуюць днём і ноччу. З рума «Забалотні» ўнесена да 2.000 шт. экспартных песаматар'ялаў. Меры да затрыманьня лесу прыняты, устаноўлены дзяжурствы на працягу сутак. Выслены 12 подак са снасьцямі і янарамі. Становішча на Зах. Дзьвіне вельмі цяжкае, бо вада прыбывае.

Рака Бярэзіна

У вярхоўі р. Гайны пушчана ў сплаў 2.500 кбм. песу. На р. Поні зьвязана каля 3.000 кбм. Ніжэй Барысава на базе леспрамгасу злоўлена каля 1.000 шт. драўніны. Завод «Камінтэрн» з-за паводкі не працуе.

На р. Нёман (Вузьдзенскі леспрамгас) уся драўніна на прыстанях утрымана, разносу няма. Ідзе гарачая работа па вязцы і пуску ў сплаў драўніны на ўсіх прыстанях. На выплавачных рэчках сплаў ужо пачаўся.

Рака Дняпро

На ўсіх прыстанях Магілеўскага леспрамгасу ідзе вязка лесу. Пасланы параходы з такелажам для поўлі зьнесенай драўніны. На р. Сож сарвана прыстань, зьнесена 700 мэтраў бачкарні. Прыняты меры да затрыманьня.

На Прыпяці пачаўся сплаў

МАЗЫР (па тэлеграфу). На Прыпяці пачаўся лесасплаў. Працуе 6.800 рабочых; грузяцца 10 барж. Зьвязана 40 проц. усёй драўніны; у сплаў пушчаны 7.000 кбм. Арганізавана арцель па сартоўцы драўніны. Разгортваньню работ перашкаджае вялікі ўзровень вады. Завод «Зорка» ўжо атрымаў з Пятрыкоўскага леспрамгасу 1.500 кбм. Фарсаваным тэмпам пачаўся лесасплаў на Тураўскім вучастку.

Па р. Случ трэба сплавіць 65.000 кубамэтраў; для фарсаваньня сплаву неабходна выслаць туды 3 маторныя подкі.

Тармозіць работу адсутнасьць балотных ботаў.

Начальнік прыстані зьвярнуўся ў Лесбел з просьбай выслаць мінімум 300 пар ботаў.

ВЫВАЗКА ЛЕСУ ДА СПЛАЎНЫХ ПРЫСТАНЯЙ

Паводле даных Лесбелу, заданьне па вывазцы лесаматар'ялаў выканана да 21 красавіка на **45,1 проц.**; заданьне 2-га кварталу выкананa на 10.5 проц. Да чыгункі вывезена звыш 1 млн. кубамэтраў, да пунктаў сплаву—1.800.000 кбм.

Гадавое заданьне па вывазцы дроў выканана на 35,4 проц. Заданьне другога кварталу—на 8,8 проц. Да чыгункі вывезена 1.117.000 кбм.; да пунктаў сплаву—538.000 кбм.

На першым месцы па вывазцы лесу ідуць **Віцебскі**, Суражскі і Рэчыцкі леспрамгасы.

Вельмі дрэнна ідзе вывазка па Бабруйскім, Барысаўскім, Боркавіцкім, Быхаўскім, Глускім, Горацкім, Ельскім, Нёманскім і Пасталоўскім вучастках, якія выкананалі менш 40 проц. кантрольнай лічбы.

ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА СПЛАВУ

ЕЛЬСК (наш кар.). Ня гледзячы на тое, што сплаў пачынаецца, што паводка пагражае зьнесьці вывезены лес, адміністрацыя Ельскага леспрамгасу не адтуває адказнасьці за даручаную ёй работу. 12 красавіка была праведзена вытворчая нарада, якая пастанавіла мабілізаваць усе сілы для падрыхтоўкі да сплаву, але пасьля нарады перамаглі дэмабілізацыйныя настроі.

Загатчык леспрамгасу тав. Булатоўскі выбыў у часовы водпуск па асабістых справах. Нам загадчыка па лесараспраўках т. Фішман выехаў на Украіну. Тэхнік па лясной гаспадарцы паехаў у Калінкавічы. Прыстані завалены лесаматар'ялам. Трэба тэрмінова вязаць плыты. А кіраўнікі сабе і вухам не вядуць.

Такія адносіны да балвота заданьня зьяўляюцца сапраўдным злачынствам.

КАЛОДА.

Наркамснаб і Белкаапсаюз павінны ўключыцца ў праверку

АРГАНІЗАВАНЫ «ПРАВДОЙ» ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІК ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СПЛАВУ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДЛЯДАМ БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦІ ОРГАНАЎ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ І КААПЭРАЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ У АДНОСІНАХ ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ СПЛАВУ. НАРКАМСНАБ БССР І БЕЛКААПСАЮЗ ПАВІННЫ ПРАВЕСЬЦІ МАСАВУЮ ПРАВЕРКУ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ФОНДАМІ УСІХ СПЛАЎНЫХ ВУЧАСТКАЎ, УСІХ ВІДАЎ СПЛАВУ. ТРЭБА ЎСТАНАВІЦЬ ПАСТАЯННЫ СУРОВЫ НАГЛЯД ЗА СТАНОВІШЧАМ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ СПЛАВУ ПРАДУКТАМІ І ФУРОЖОМ ВАРАМІ. ПРАДУКТАМІ І БЕЛКААПСАЮЗ НЯ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ПРАВЕРКУ. ДАГЭТУЛЬ ДРЭННА СТАІЦЬ СПРАВА З ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕМ ПУНКТАЎ СПЛАВУ ПРАДУКТАМІ І ФУРАЖОМ, А БЕЛКААПСАЮЗ МАРУДЗІЦЬ З АРГАНІЗАЦЫЯМІ ПРАВЕРКІ. НА ГЛЕДЗЯЧЫ НА ДАГАВОР З ЛЕСБЕЛАМ — АДКРЫЦЬ 17 СТАЛОВЫХ ДЛЯ ПЛЫТАГОНАЎ НА ПУНКТАХ СПЛАВУ, АДКРЫТЫ ТОЛЬКІ 2 СТАЛОЎКІ І 2 ЧАЙНЫЯ.

Увага мэханізацыі сплаву!

На сплаве ў БССР працуе вельмі мала мэханічных установак як цягавых, так і пагрузачна-выгрузачных. Мэханізацыя сплаву ў нас — гэта самае вузкае месца. Работнікі сплаўных арганізацый прывыклі працаваць дзедаўскімі спосабамі і зусім ня цікавяцца пытаньнямі мэханізацыі работы. Між тым мэханізацыя ўстаноўкі на сплаве могуць значна паскорыць пастаўку драўніны і рацыналізаваць работу плытагонаў.

У прыватнасьці, для мэханізацыі сплаву патрэбны маторы. Трактарны мотор можа цягаць караваны лесу на вялікіх паскорыць сплаў, падвозіць харчы і матар'ялы. З паловы мая адзін з трактараў, набытых Лесбелам, пачне выпісці на работу. Калі набыць пераносныя маторы, можна дабіцца сапраўднага рэвалюцыі на сплаве. Зараз, калі ня рацца сустрэчны вецер, ні калі ня трапляюць у ціхія месцы, яны звычайна чакаюць, пакуль вецер сьціхне, а прыдзе маторны катэр і дапамога. Ужываньне маторных лодак магчымасьць зьвяць гэтае дзікае мальнае зьявішча, паскорыць сплаў. Ва многіх установах ёсьць пасаджаныя маторы, яны валяюцца, як непатрэбныя, і Лесбел павінен набыць іх і арганізаваць ім рухавікоў, якія можна скарыстаць на сплаве.

Для работы на вазёрах патрэбны так званыя «варпавальныя» лодкі, якіх у БССР яшчэ няма. Як вядома, плывуць вазёрах плывуць вельмі павольна, таму іх цяжка, для гэтага патрэбна шмат рабочых; а «варпавальная» лодка, калі на якары, заціпае да пункту на 500 м., які пакручваецца на вазёдзі і цягне за сабою плыты.

Адну такую ўстаноўку абяцае саюзлеспрам.

Для таго, каб мэханізаваць сплаў, трэба ліквідаваць кансэрватыўных пастаў сплаўных работнікаў, прымусіць іх адмовіцца ад дзедаўскіх мэтадаў працы. Мэханізацыя павінна зайняць пачэсное месца ў сплаве 1931 году.

СУКАЛА.

Бюракратаў—да адказнасьці

ВУЛА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). РУМЫ ВУЛЬПІЧЫНЫ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗЬНЕСЬНЯ ПАВОДКАЙ. У ТОЙ-ЖА ЧАС НА СТ. ЛОЎША 17 ДЗЕН ЛЯЖАЛІ СМАЛА І КАНАТЫ, ПАТРЭБНЫЯ ДЛЯ ЎМАЦАВАНЬНЯ РУМАЎ. БЮРАКРАТАЎ З ПОЛАЦКАГА ЛЕСПРАМГАСУ, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ СПЛАЎ, ТРЭБА ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

З лістоў рабселькораў

Будаўнічыя арганізацыі Мазырчыны зусім ня рыхтуюцца да будаўнічага сэзону. Плян будаўнічых работ яшчэ ня выпрацаван. Да гэтага часу яшчэ не гатовы праекты пабудоў даіцячага дыспансэру, хлебазаводу і гаражу. Няма яшчэ пляну забясьпячаньня і перапляніваньня вуліц. Да складаньня праектаў прыступілі толькі цяпер, калі трэба ўжо прыступіць да будаўніцтва. Камгас да гэтага часу яшчэ не адвёў вучасткаў зямлі для пабудовы гаражу і дамоў для рабочых фабрык **«Беларусь»** і **«Чырвоны Кастрычнік»**.

Будаўнічыя арганізацыі ня ведаюць нават, колькі яны павінны атрымаць будаўнічых матар'ялаў. Няма яшчэ парадаў на лесаматар'ялы. Будаўнічыя арганізацыі і Будкантора павінны зараз-жа ўзмацніць падрыхтоўку да будаўніцтва.

З—н.

* * *

Фабрыка **«Чырвоны Кастрычнік»** прыняла шэфства над **Мазырскім ЦРК.** Фабком вылучыў брыгаду з лепшых ударнікаў, якая ўжо прыступіла да працы. Брыгада выявіла, што галоўны **Фіялкаў** сам ня зьяўляўся пашкодзіць ЦРК і атрымліваў прадукты як... манец жонкі. Шмат работнікаў працуе не плаціці паю і т. д. З дапамогай гэтай брыгады ўдасца выкрыць буйныя недахопы, якія ёсьць у работе ЦРК.

Яргоп.

* * *

На ф-цы «Кастрычнік», абутковай, шчотачнай фабрыках і на заводзе «Камунар», імя Варашылава і «Бальшавік» работа на сацыяльным страхаваньні вінна быць перабудавана шляхам арганізацыі асобных выплатных пунктаў. 13-га красавіка была склікана канфэрэнцыя прадстаўнікоў гэтых прадпрыемстваў, аднак, за выключэньнем фабрыкі «Кастрычнік», піводнае прадпрыемства прадстаўнікоў ня прысылала. Такая лаацянка работы органаў сацстрахаваньня вінна быць сурова асуджана. Прэзыдыум ЦСПСБ павінен высьвятліць прычыны такіх нядбайных адносін да сацстрахаваньня ў прадпрыемствах і ў бажнейшай прычыны 5-га пленуму УсеЦСПС.

Паведамленьні

— 28 красавіка г.г. у 18 гадз. у Культпропе ЦК КП(б)Б адбудзецца пасяджэньне камісіі партасьветы мэтадбюро ЦК КП(б)Б. Павінны зьявіцца наступныя т.т.: Модэль, Улазаў, Гаеўскі, Голанд, Гурвіч, Яцкевіч, Орліс, Немец.

— 29 красавіка у 19 гадз. адбудзецца нарада сакратароў ячэек СВБ па пытаньні падвядзеньня вынікаў антывялікоднай кампаніі. На нараду запрашаецца ўвесь актыў СВБ.

— 29 красавіка у 18 гадз. у памяшканьні ЦКК-РСІ (Савецкая, 55, першы паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднанага бюро скаргаў, на якім будуць разгледжаны наступныя справы: 1. Справа студэнтаў Нартасу ВДУ — Вераса і Нікіцкага. 2. Справа студэнтаў рабфаку Лур'е Х. М. з. Справа аб пагашэньні заназычанасьці ВКСаюзам Машынатрасту —Масква. 4. Аб бюракратызьме бел. к-ры Дзяржбанку ў асобе т. Матусэвіча з перадачам пэнсіі сакратаром раўсакавік месяц 5. Справа пенсіі Шафрапава Ануфрыя (зав. «Чырвонага кастрычніка». 6. Аб прыёме на біржы працы на завод «ДАМАНА». 7. Справа Касьцяна. 8. Тоўсьцік. 9. Аб трубасьлясах кастрычніцкай станцыі Івановаі. Апрамях гэтыя справы датычаць, не зьявіцца. Выклікаюцца работы: целі т.т Лейкінд, Сталін, Вайнер і Сакун — зав. «Чырвонага зорка», Іванову, Сьверанускі—фабрыкі «Кастрычнік», Шлапакоў і Кочарава «Энергія», Розін і Люстэрнік—«Мунар».

Адказны рэдактар С. БУДЗІ

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр І. Гурскі

28 красавіка адкрыты спэктакль **КАЧАГАРЫ** п'еса ў 4 дзеях.

Пачатак у 8 гадз. веч.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖТЭАТР

Куплены паказ АЗЭТ'ам на 23-IV **ПЕРАНОСІЦЦА** на 29-IV—31 г.

Усе білеты маюць моц на 29-IV—31 г.

„Чырв. Зорка" Нач. 7. 8-45 і 10-30 — **СУД** павінен працягвацца. Звыш праграм. гукавы фільм 13-ы КАСТРЫЧНІК.

„Культура" — Новы фільм **НАНТАГ** (Бацькі і дзеці). Звыш праграм.—хроніка Белдзяржкіно. Пач. сэансаў 7. 8-45 і 10-30.

„Кінтэрнацыянал" — Замежны фільм **Апошнія навіны** Звыш праграмы—хроніка № 14 Саюзкіно. Пач. 1 с.—6 г. Каса—з 4 г. 30 м.

„Піталстары" — **НАЧНЫ РАМІЗЬНІК** драма ў 6 частках. Пачатак 1 с.—6 г.

„Юны Піянэр" — Цікавы фільм **ВАСЯ РЭФАРМАТАР** Пачатак з 1 г. дня. Каса—з 11 г.

„СПАРТАК", Нач. 7. 8-45 і 10-30 Каса—з 5 гадз. — З панядзелка 27 красавіка Выдатны фільм **ЖЫВЫ ТРУП** паводле раману **Л. Талстога.** Драма ў 7 частках.

БЕЛАРУСКІ БУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ

АБВЯШЧАЕ,

што **ЗАНЯТКІ** ў інстытуце для прыняты ў красавіку м-цы (2-гі прыём) **ПАЧНУЦЦА 3-ГА МАЯ г. г.**

Усе ранічныя студэнтамі на будаўнічы і вуга-даражны факультэты абавязаны ў гэты дзень зьявіцца ў памяшканьне інстытуту а 8-й гадзіне раніцы.

Незьявіўшыяся 3-га мая будуць лічыцца выбыўшымі з ліку студэнтаў інстытуту.

Менскі Дзяржаўны Архітэктурна-Будаўнічы Тэхнікум

паведамляе ўсіх зацікаўленых у кастрычніку 1930 году студэнтамі тэхнікуму на **отдзеньскі набор,** што **заняткі** апошняга **пачнуцца 5-г мая** 1931 году.

429

У сераду, 29 красавіка г. г., роўна ў 7 гадзін вечара ў залі пасяджэньняў Менгарсавету (пляц Волі, № 4, 3-ці паверх) адбудзецца

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ МЕНГАРСАВЕТУ.

Яўка членаў і кандыдатаў савету абавязкова. Запрашаюцца кіраўнікі прадпрыемстваў, прадстаўнікі фабзаўмясцкомаў і вытворчых нарад і дэлегаткі, прымацаваныя да працы ў савеце.

Парадак дня:

1. Аб выманаьні прамфінпляну за 1-шы квартал г. г. (дакл. ВСНГБ).

2) Прыняцьце рэзалюцыі па дакладу аб будаўніцтве.

Менгарсавет.

З 22 красавіка г. г. МЦРК пачынае

ВЫДАЧУ НОВЫХ НАБОРНЫХ КАРТАЎ

пайшчыкам і напайшчыкам па наступных пунктах:

1-е аддзяленьне міліцыі:

Лейнская д.—8 Райбюро № 1.

2-е аддзяленьне міліцыі:

1-шы пункт Крапоткіна вул., 16—Нардом.
2-гі „ Рог Шырокай і Н.-Камароўскай—крама МЦРК, 33
3-ці „ Камунальн., 31—был. памяшк. Райбюро. 3.
4-ты „ Рог Савецкай і Камароўскай—крама 11.
5-ты „ Першамайская. 3 — крама 138.
6-ты „ Дзяўгабродзкая, 48—крама 96.

3-е аддзяленьне міліцыі:

1-шы пункт: Клюб імя Лейіна—пасажырская станцыя
2-гі „ Серабранка, 10—крама 62.
3-ці „ Сурагская, 38—крама 149.

4-е аддзяленьне міліцыі:

1
2-шы пункт: Камунальная Набережная. 1—Райбюро 4.
3-гі „ Пляц 25-га кастрычніка—крама 75.
-ці „ Рэспубліканская, 21—крама 123.

Грамадзяне, якія жывуць у домах ЖАКТ'аў, атрымліваюць наборныя карткі з памяшканаяў ЖАКТ'у, згодна раскладу і № дамоў па кожным �жАКТ'у.

Пры атрыманьні наборных картак неабходны наступныя дакументы:

а) паштовую кніжку і наборныя карткі і для дзацей—мэтрыкі;

б) для пайшчыкаў, якія атрымліваюць карткі першай катэгорыі усіх 3-х сьпісаў, — неабходна даведка аб месцы і выконваемай працы.

Па ўсіх гэтых пунктах ёсьць падрабязны раскладкалі кожная вуліца і № дому павінны зьявіцца для атрымань